

Прагарама тэлебачання на наступны тыдзень 20 КАНАЛАЎ



Магілёў перадае званне культурнай сталіцы СНД і Беларусі. СТАР 3



У наступным годзе кандуктары стануць рэвізорамі. Чаму? СТАР 7



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 СНЕЖНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 230 (27595) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «МЫ ГАНАРЫМСЯ АДНОСІНАМІ З КІТАЕМ»

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі заявіў 5 снежня на сустрэчы з паслом Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі Гун Цзяньвэем з нагоды завяршэння яго дыпламатычнай місіі ў краіне, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Прэзідэнт падкрэсліў: «Вельмі важна, што гэтыя адносіны пачалі складвацца не ўчора і не сёння, калі Кітай стаў вызначальнай дзяржавай у свеце, а даўно — калі Кітай толькі ўставаў на ногі. І тады мы ўбачылі ў развіцці Кітая тыя расткі, на якія нам трэба было звярнуць увагу. Мы многаму навучыліся ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы».

Паводле слоў Прэзідэнта, у Беларусі кожны, калі яго спытаць пра супрацоўніцтва Беларусі і Кітая, раскажа аб гэтым вельмі шмат, і гэта будзе толькі пазітыўны водгук.

«Кітай — гэта ўжо не будучыня планеты, гэта сучаснасць», — перакананы Аляксандр Лукашэнка. На яго думку, немагчыма прыняць рашэнне па глабальных і нават рэгіянальных пытаннях, не ўлічваючы пазіцыі і меркаванні Кітайскай Народнай Рэспублікі.

На думку кіраўніка дзяржавы, нямала зроблена ў супрацоўніцтве паміж Беларуссю і Кітаем, у тым ліку за апошнія два гады, калі паслом быў Гун Цзяньвэй. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што дыпламат «быў надзейным сябрам і стараўся склеіць адносіны паміж дзяржавамі ў адрозненне ад некаторых паслоў, якія робяць зусім наадварот». Аляксандр Лукашэнка даў высокую ацэнку дзейнасці кітайскага пасла і выказаў надзею, што той вопыт і веды, якія Гун Цзяньвэй набыў у Беларусі, дадуць яму магчымасць і ў далейшым садзейнічаць умацаванню адносін паміж дзвюма краінамі.

У сваю чаргу пасол падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за выказаную высокую ацэнку яго дзейнасці: «Гэта я прымаю не толькі ў свой адрас, але і ў адрас кіраўніцтва і ўрада маёй краіны». Дыпламат падкрэсліў важнасць візіту беларускага лідара ў Пекін, які адбыўся ў ліпені 2013 года, і запэўніў, што кітайскі бок будзе прытрымлівацца ўсіх дамоўленасцяў, дасягнутых на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам.

## УЗГАДНІЦЬ НАДЗЁННЫЯ ПЫТАННІ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

**Пытанні маючага адбыцца пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы абмеркаваны ўчора на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі, старшыні ВДС Аляксандра Лукашэнкі і дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Рыгора Рапоты, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы папрасіў Рыгора Рапоту праінфармаваць аб тым, як ідзе падрыхтоўка парадку дня маючага адбыцца пасяджэння ВДС. «Што там не стыкуецца, можа, што не ўзгоднена? Можа, цяпер патрэбна ўмяшанне прэзідэнтаў, каб менш было спрэчак на Вышэйшым дзяржсавеце?» — запытаў Аляксандр Лукашэнка. Ён пацікавіўся таксама сітуацыяй з падрыхтоўкай да саюзнага Саўміна. «Гэта асноўны наш рабочы орган, усе пытанні абмяркоўваюцца там і ўносяцца на Вышэйшы дзяржсавет», — адзначыў Прэзідэнт.

«Хацеў бы пачуць вашы ацэнкі беларуска-расійскіх адносін у кантэксце тых праблем, якія сёння ўзнікаюць, у тым ліку і канфлікту Еўрасаюза з Украінай, як гэта «праламляецца» на нашы адносіны, якія ўрокі, высновы мы павінны зрабіць», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы, звяртаючыся да Рыгора Рапоты.

Як адзначыў дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы, цяпер ідуць апошнія ўзгадненні тэрмінаў правядзення ВДС. Плануецца, што пасяджэнне Вышэйшага дзяржсавета пройдзе ў канцы снежня. Што датычыцца парадку дня, то ён складаецца з некалькіх блокаў. Плануецца разгляд вынікаў бюджэтнай палітыкі на гэты год і зацвярджэнне бюджэту на 2014 год, абмеркаванне эканамічнай палітыкі, у тым ліку вынікаў гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва дзвюх краін за 2013 год, а таксама пытанняў перспектыўных напрамкаў развіцця Саюзнай дзяржавы.

## НАЗНАЧАНЫ ДЗЯРЖСАКРАТАР САВЕТА БЯСПЕКІ



Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў Аляксандра Мяжуева дзяржаўным сакратаром Савета Бяспекі Беларусі. Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 5 снежня, паведамілі **БЕЛТА** ў прэс-службе беларускага лідара.

## КОЖНАМУ ВЕКУ СВАЯ МАЛЯВАНКА



**Традыцыйны від беларускага народнага мастацтва — маляванку — імкнуцца адрадзіць студэнты кафедры касцюма і тэкстылю Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Штогод падчас летняй практыкі старшакурснікі творча знаёмяцца з гісторыяй і тэхналогіяй традыцыйнай беларускай маляванкі і тымі творчымі магчымасцямі, якія яна прадастаўляе мастаку-тэкстыльшчыку. Пасля — абавязковае выкананне двух заданняў: першае — копія з арыгінала традыцыйнай беларускай маляванкі, другое — стварэнне ўласнага арыгінальнага мастацкага твора ў гэтай тэхніцы. Абодва віды такіх студэнцкіх работ, выкананых у асноўным за апошнія два гады, былі прадстаўлены на адкрыцці выставы «Маляванка: традыцыі і сучаснасць» у сценах Музея старажытнабеларускай культуры.**

Студэнтка Кацярына БАХЦІЯРАВА *(на фота)* так захапілася цудоўнай і самабытнай тэхнікай нашых бабуль, што вырашыла стварыць свой сучасны твор. Юрый Гагарын з жонкай Валянцінай аб'ядналіся ў маляванцы «Каханне як космас». Гэты цікавы погляд маладога мастака сведчыць пра тое, што такі традыцыйны від беларускага мастацтва можна выкарыстоўваць і сёння.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Сямён ШАПІРА, старшыня Мінскага аблвыканкама:**

***«У розных рэгіёнах краіны праблемы падобныя. Ёсць спрэчныя пытанні, якія грамадзяне або суб'екты гаспадарання не могуць вырашыць паміж сабой па-суседску. У нас створаны аднолькавыя эканамічныя і заканадаўчыя ўмовы, але ў адных атрымліваюцца добрыя вынікі ў рабоце, а ў іншых — не. Таму мясцовай уладзе неабходна дапамагаць іх вырашаць. Трэба беражліва працаваць з кадрамі, падбіраць самых годных і таленавітых, навучаць іх, праяўляць клопат, а не толькі патрабаваць з іх. Тады атрымаем аддачу, я ў гэтым не сумняваюся».***

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | 0° |
| Віцебск | 0° |
| Гомель | + 1° |
| Гродна | 0° |
| Магілёў | 0° |
| Мінск | 0° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.12.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9390,00 | ■ |
| Еўра | 12800,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 283,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1136,12 | ▼ |

■ Праверана на сабе

## СТРАСЦІ ПА БАЛКОНЕ

### ПАДЧАС ПАДРЫХТОЎКІ ГЭТАГА АРТЫКУЛА... ПАЦЯРПЕЎ АДЗІН БАЛКОН.

**Пачалося ўсё з таго, што аўтар гэтых радкоў яшчэ ў жніўні вырашыў пры дапамозе камунальнікаў пафарбаваць балконную раму і вокны. Зразумела, не за «дзякуй», афіцыйна хацеў аплаціць паслугу. Аказалася, што камунальнікі не вельмі зацікаўлены зарабляць на платных паслугах насельніцтву...**

### «Алё, гэта дыспетчарская?»

Міхаіл Зошчанка ў ліку іншага вядомы тым, што напісаў шмат апавяданняў, актуальных і праз дзясяткі гадоў. Памятаеце яго гісторыю пра печ? Калі прыйшла камісія і ніяк не хацела прызнаваць, што печ чадзіць... Папулярны артыст Аляксандр Філіпенка віртуозна агучыў той твор яшчэ ў савецкія гады. Лаўры Зошчанкі для мяне — недасяжная вышыня. Але і мая гісторыя, упэўнены, павінна прагучаць, бо можа здарыцца з кожным. Тое, што адбылося, адбіла ў мяне ўсялякае жаданне звяртацца па дапамогу да работнікаў сістэмы ЖКГ. Абурае, што за кватэру плачу своечасова, а са мной так... СТАР. 6

## МІНЧАНАМ ГРЫП НЕ ПАГРАЖАЕ?

**На 4 снежня ў Мінску супраць грыпу вакцыянавалі ўжо больш як 681 тысячу чалавек, у тым ліку больш як 567 тысяч — за кошт сродкаў бюджэту: гэта асобы з групы высокай рызыкі развіцця постгрыпозных ускладненняў, групы высокай рызыкі інфіцыравання, а таксама педагогі і медыцынскія работнікі.**



Фота БЕЛТА.

У гарадской санэпідслужбе адзначаюць, што ў параўнанні з мінулым эпідсезонам удвая павялічылася колькасць пацыентаў ва ўзросце 65 гадоў і больш, прышчэпленых супраць грыпу: у 2013 годзе — больш як 100 тысяч чалавек, а ў 2012 годзе такіх было 50 тысяч.

За кошт сродкаў прадпрыемстваў і арганізацый прышчэпкі зрабілі 103 тысячы чалавек. Кіраўнікі амаль усіх буйных прадпрыемстваў з колькасцю працаўнікоў 1000 і больш чалавек забяспечылі вакцынацыю супраць грыпу больш як 40% сваіх работнікаў. Сярод іх — ААТ «МАЗ», Мінскі завод колавых цягачоў, Мінскі падшыпнікавы завод, ААТ «Крыніца», «Белмедпрэпараты», універмаг «Беларусь» і іншыя. Найбольш высокі ахоп вакцынацыяй адзначаецца на прадпрыемствах, дзе кампанія па імунізацыі праводзіцца ўжо не першы год і дзе рэгіструюцца нізкія ўзроўні захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі і грып сярод работнікаў.

Яшчэ каля 11 тысяч мінчан зрабілі прышчэпкі за ўласны кошт.

Медыкі нагадваюць, што ў паліклініках горада яшчэ застаецца невялікі запас вакцын для правядзення імунізацыі асоб з групы рызыкі, якія па стане здароўя не маглі зрабіць прышчэпкі ад грыпу раней.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### БРЫТАНІЯ ХОЧА ЗМЯНІЦЬ МІГРАЦЫЙНЫЯ ПРАВІЛЫ ЕС

Брытанія хоча змяніць прынцып свабоднага перамяшчэння працоўнай сілы ў рамках ЕС. Пра гэта міністр унутраных спраў краіны Тэрэза Мэй паведаміла сваім калегам па Еўрасаюзе на пасяджэнні ў Бруселі. З 1 студзеня 2014 года ў ЕС павінны быць зняты абмежаванні на перамяшчэнне грамадзян Балгарыі і Румыніі. Пазіцыя Вялікабрытаніі заключаецца ў тым, што вольны доступ на рынак працы краін ЕС не павінен прывесці да масавай міграцыі. Шэраг краін Еўрасаюза лічыць прынцып свабоднага перамяшчэння працоўнай сілы адным з фундаментальных прынцыпаў еўрапейскай інтэграцыі. Тэрэза Мэй жа ставіць пытанне аб тым, чаму ўрадам не дазваляецца ўстанаўліваць абмежаванні на колькасць мігрантаў з краін Еўрасаюза. «У будучыні ў дагаворах аб уступленні ў ЕС мы павінны будзем прапісаць запаволены механізм атрымання доступу на рынак рабочай сілы, які будзе працаваць да таго часу, пакуль мы не пераканаемся, што ён прадухіляе масавую міграцыю». «Правільна, калі ўрады краін ЕС рэфармуюць правілы свабоднага перамяшчэння працоўнай сілы», — заявіла міністр. Карэспандэнт Бі-бі-сі ў Бруселі Крыс Морыс паведамляе, што да просьбаў Брытаніі не дапусціць ціску на сістэму сацзабеспячэння, які рэзка ўзмацняецца з-за прытоку мігрантаў, у іншых краінах Еўрасаюза паставіліся з разуменнем. У суседзяў па ЕС тыя ж праблемы.

Але на палітычным узроўні змена асноватворнага прынцыпу еўрапейскай інтэграцыі засталася без падтрымкі. Як растлумачыў дыпламат адной з усходнееўрапейскіх краін, ніхто не пагодзіцца з тым, каб да грамадзян некаторых краін ставіліся як да людзей другога гатунку.

Раней прэм'ер Вялікабрытаніі Дэвід Кэмеран заявіў, што грамадзяне іншых еўрапейскіх краін не павінны мець права атрымліваць дапамогі на працягу першых трох месяцаў знаходжання ў Вялікабрытаніі. Яны таксама не змогуць атрымліваць дапамогі на працягу больш за паўгода ў выпадку адсутнасці перспектывы працаўладкавання. Камісар ЕС па сацыяльных пытаннях Ласла Андар заявіў у адказ, што Вялікабрытанія можа стаць «гідкай» краінай, калі будзе абмяжоўваць доступ да дапамог і патрабаваць змены прынцыпу свабоднага руху працоўнай сілы.

### МАЛДОВА ЗАПУСЦІЛА АДЗІНЫ БРЭНД «ВІНО МАЛДОВЫ»

У Малдове для больш эфектыўнага прасоўвання на экспарт вінаробнай прадукцыі запушчаны адзіны брэнд «Віно Малдовы» (Vinurile Moldovei), паведамляюць інфармагенцтвы. Плануецца, што з гэтага часу ўсе высакаякасныя малдаўскія віны будуць прадавацца ў свеце пад адным брэндам «Віно Малдовы». Кампаніі змогуць рэалізоўваць прадукцыю пад гэтым брэндам, толькі калі будуць адабраны Нацыянальным бюро вінаграду і віна. На бутэльках з'явіцца этыкетка з выявай бусла.



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У ВАТЫКАНЕ СТВАРЫЛІ КАМІТЭТ ПА БАРАЦЬБЕ З ПЕДАФІЛАМІ

**Папа Рымскі Францыск 5 снежня распарадзіўся стварыць спецыяльны камітэт па барацьбе з педафіліяй у Каталіцкай царкве, паведамляе Agence France-Presse.**

Адначасова з гэтым ён даручыў святарам прадставіць пастырскі клопат і дапамогу тым людзям, хто пацярпеў ад дзеянняў святароў-педафілаў. Адпаведныя рашэнні былі



прыняты па рэкамендацыі Савета кардыналаў царквы. У заяве, распаўсюджанай з гэтай нагоды, сказана, што Касцёл возьме на ўзбраенне палітыку нулявой цярпімасці да ўсіх праяў педафіліі. Чакаецца, што камітэт выпрацуе асобныя настаўленні для каталіцкіх святароў у розных краінах свету, а таксама распрацуе меры па выяўленні патэнцыяльных педафілаў яшчэ да таго, як яны будуць рукапакладзены. Цяпер спецыялісты з Ватыкана займаюцца расследаваннем тысяч паведамленняў аб парушэнні правоў дзяцей, а таксама аб утойванні інфармацыі пра злачынствы вышэйшымі царкоўнымі іерархамі.

КОРАТКА

Сацыяльная выстава-кірмаш для людзей старэйшага пакалення «50 плюс» пройдзе з 12 па 15 снежня ў сталічным выставачным комплексе «Белэкспа» па вуліцы Я. Купалы, 27. На кірмашы будуць прадавацца тавары беларускіх вытворцаў з мінімальнымі гандлёвымі нацэнкамі.

Паштовую скрыню для пісем Дзеду Марозу ўстанавілі ў пасылачнай зале сталічнага Галоўпаштамта, а таксама ў аддзяленнях паштовай сувязі Мінска. Каб Дзед Мароз атрымаў пісьмо, неабходна правільна пазначыць на канверце з маркай адрас атрымальніка: Белавежская пушча, в. Каменюкі, Брэсцкая вобласць, індэкс — 225063 (з паметкай Дзеду Марозу).

Бязвізавы ўезд для балельшчыкаў хакейнага ЧС у Мінску ў 2014 годзе будзе дзейнічаць з 25 красавіка па 30 мая. Для ўезду грамадзянін павінен будзе прад'явіць білет у папяровым або ў электронным выглядзе і пашпарт.

Міністэрства культуры Беларусі аб'явіла конкурс на стварэнне дызайн-праекта ўзнагароды Нацыянальнай тэатральнай прэміі. Пераможца атрымае Br10 млн. Каб прыняць у ім удзел, неабходна да 13 снежня 2013 года ўключна падаць заяўку на адрас: г.Мінск, пр. Пераможцаў,11, каб. 309.

Беларуская чыгунка выдзеліла спецыялізаваную касу на станцыі Мінск-Пасажырскі для афармлення білетаў, аплачаных праз інтэрнэт. З 5 снежня пасажыры, якія аплацілі білеты праз інтэрнэт, абслугоўваюцца ў касе № 8 у першачарговым парадку.

## ЯК ВЫ СТАВІЦЕСЯ ДА МАГЧЫМАГА ЎВЯДЗЕННЯ ПАДАТКУ З БЕСПРАЦОЎНЫХ?

**Ужо амаль два месяцы ў беларускай інтэрнэт-прасторы шырока абмяркоўваецца верагоднасць з'яўлення новага падатку — з грамадзян, якія афіцыйна нідзе не працуюць. На ўзроўні чутак называюцца тэрмін яго ўвядзення і нават сума. Нібыта з 2015 года кожны беспрацоўны беларус будзе аддаваць дзяржаве 20 базавых велічынь. Міністр працы і сацыяльнай абароны краіны Марыяна Шчоткіна заявіла падчас анлайн-канферэнцыі, што пытанне новага падатку трэба дакладна прапрацаваць, і параіла ўносіць свае прапановы.**



**Антаніна МОРАВА, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі ў 2001-2006 гадах:**

— Калі гэты падатак і будзе ўведзены, то трэба загадзя акрэсліць у нарматворчых дакументах усе спрэчныя моманты, даць выразныя азначэнні тэрмінам. Напрыклад, што такое дармаедства ці лайдацтва, па якіх крытэрыях яно вызначаецца... Але канчатковага стаўлення я зараз выказаць не магу. Спярша трэба пабачыць сам тэкст праекта ўказа, а пасля рабіць нейкія высновы.



**Ганна УЛЬРЫХ, сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ БДУІР:**

— Магчымасцяў легальна зарабіць цяпер дастаткова. Калі хтосьці незадаволены сваім заробкам, трэба шукаць больш высокааплатную працу. У сталіцы, напрыклад, хапае ўсялякіх курсаў прафесійнай падрыхтоўкі нават з нуля. Так, не кожнаму дадзена ад прыроды стаць праграмістам, але калі няма фізічных супрацьпаказанняў, можна пайсці, напрыклад, на будоўлю, як гэта рабілі мае знаёмыя. Проста ўсё залежыць ад самога чалавека...



**Іван С.** *(фатаграфавацца і называць прозвішча адмовіўся),* **працуе неафіцыйна:**

— Негатыўна ўспрымаю гэтую ідэю. Аднак і лайдацтва таксама не падтрымліваю. Я б размежаваў тут дзве гранічныя сітуацыі. Адна справа, калі чалавек гадамі нідзе не працуе, выцягвае грошы з родных ды знаёмых на чарговую дозу выпіўкі. І зусім іншае, калі людзі працуюць неафіцыйна, без фармальнага ўладкавання на працу — «шабашаць» на будоўлях ці займаюцца фрылансам. Але тут трэба адказаць на пытанне: чаму людзі выбралі менавіта гэты шлях? Можа, справа ў велічыні заробку?

**Падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Аляксандр РАДЗЬКОЎ:
# ТЫХ, ХТО ІДЗЕ НА СЛУЖБУ Ў МІЛІЦЫЮ, ПАВІННА ВЫЗНАЧАЦЬ УНУТРАНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

**Такое меркаванне ўчора ў час нарады кіраўнікоў кадравых апаратаў МУС/Паліцыі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, якая праходзіць у Мінску 5-7 снежня, выказаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

«Вельмі важна, што ў нашай краіне сабраліся адказныя асобы, якія забяспечваюць кадравы патэнцыял праваахоўных органаў, — сказаў Аляксандр Радзькоў. — З самага пачатку трэба вызначаць, хто ідзе на службу ў міліцыю, ці ёсць у яго стрыжань, ці можа ён процістаяць злачыннасці. Ён павінен абараняць і грамадства, і краіну, і сваю сям'ю. У ім павінен быць стрыжань — унутраная адказнасць». Ён адзначыў, што моладзь, якая сёння прыходзіць на работу ў міліцыю, павінна быць падрыхтавана не толькі фізічна, але і духоўна.

Немалаважную ролю ў гэтай сістэме адыгрывае выхаванне праз тэлебачанне, газеты, радыё, добрую кнігу. З гэтай мэтай у Беларусі створаны грамадскі савет пры МУС, старшынёй якога з'яўляецца старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі Генадзь Давыдзька.

Аляксандр Радзькоў таксама расказаў, што нядаўна пацікавіўся, чым маладыя хлопцы, якія сёння прыходзяць у міліцыю, адрозніваюцца ад тых, якія прыходзілі дваццаць гадоў таму. «Адказ быў такі: яны лепш падрыхтаваны інтэлектуальна, але горш фізічна развітыя. Тут трэба дапрацаваць», — падкрэсліў ён.

У нарадзе кіраўнікоў кадравых апаратаў МУС/Паліцыі дзяржаў — удзельніц СНД прымаюць удзел дэлегацыі Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Туркменістана, Узбекістана і Украіны. На парадку дня два асноўныя пытанні: патрыятычнае і духоўна-маральнае выхаванне асабовага складу, а таксама актуальныя праблемы і перспектывы кадравай палітыкі. Вынікам сустрэчы стане прыняцце канкрэтных кіраўніцкіх рашэнняў, якія будуць садзейнічаць развіццю арганізацыйных форм узаемадзеяння ў сферы кадравага забеспячэння.

Кадравыя нарады ў маштабах Садружнасці праводзяцца з 2005 года. Першая адбылася ў Краснадары. Цяперашняя сустрэча з'яўляецца 18-й па ліку.

# «Дапамажыце вярнуць ліхтар. Яшчэ ўвесну яго забралі»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**З вёскі Даўнары Стаўбцоўскага раёна на «гарачую лінію» нашай газеты патэлефанавала са сваёй праблемай (зрэшты, не толькі — тое ж датычыцца і суседзяў) Леакадзія Іосіфаўна Чэрнік: на вуліцы не гарыць ліхтар. Дакладней, яго зусім няма, а між тым гаворка ідзе пра пачатак населенага пункта.**

— Ліхтар забралі яшчэ ўвесну. Ён быў новым, але вісеў на адным правадку, мог ўпасці, барані Божа, каму на галаву. Прыехалі рамонтнікі і знялі яго. Абяцалі восенню на месца вярнуць. Вось і восень тая ўжо прайшла, але ліхтара ўсё няма. Я па першым часе асабліва нікому не дакучала, усё чакала. Але ж цяпер цёмна большую частку сутак. Холадна, страшна... У сельскім Савеце сказалі, што накіравалі ліст у раённыя электрасеткі з просьбай аб вяртанні ліхтара. Тэлефаную туды, каб даведацца тэрміны, а мяне зноў накіроўваюць у сельскі Савет. Няўжо гэта такая праблема — павесіць ліхтар? Дапамажыце, калі ласка, — прасіла Леакадзія Іосіфаўна.

Старшыня Рубяжэвіцкага сельскага Савета Ала Стралкоўская пацвердзіла, што накіравала ў раённыя электрасеткі ліст з просьбай не толькі адносна вёскі Даўнары, але і ў дачыненні астатніх населеных пунктаў, у якіх трэба замяніць лямпачкі або апоры. «Безумоўна, як мінімум мы імкнёмся, каб былі асветлены пачатак і заканчэнне населеных пунктаў». Паводле слоў Алы Антонаўны, «пытанне знаходзіцца на кантролі». Аднак і яна не ведала магчымай даты выканання патрэбных работ.

Калі мы патэлефанавалі начальніку раённых электрасетак Вадзіму Качановічу, той выказаў сумненні, што ліхтар мог вісець на адным правадку. «Там жа кранштэйны. Відавочна, ліхтар выйшаў са строю, таму яго і забралі для рамонту». Чаму тады пасля назад не вярнулі? І вось тут Вадзім Леанідавіч, нібы завочна адказваючы на пытанне Леакадзіі Іосіфаўны пра складанасць праблемы, зазначыў, што замяніць ліхтар няма чым... «Нам практычна не дасылаюць новых свяцільнікаў. Даводзіцца рамантаваць тое, што ёсць». Тым не менш Вадзім Качановіч паабяцаў дапамагчы. «Літаральна заўтра пашлю ў вёску работнікаў, каб паглядзелі, што можна зрабіць».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Блізкая ўлада

# САДОК ДЛЯ ШМАТДЗЕТНАЙ СЯМ'І І ЭЛЕКТРАЛІНІЯ ДЛЯ ЗАБУДОЎШЧЫКА

**Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР правёў чарговую прамую тэлефонную лінію з жыхарамі вобласці. На працягу дзвюх гадзін да кіраўніка вобласці змаглі дазваніцца 29 чалавек. Самае першае пытанне губернатар узяў пад асабісты кантроль.**

З месцамі ў дзіцячыя садкі ў абласным цэнтры ёсць пэўныя цяжкасці. А ў новых спальных раёнах ніхто нават не вядзе гаворку пра садок побач з домам. Але тут выпадак асаблівы. У маладой жанчыны чацвёра дзяцей: двое з іх ходзяць у садок, адно нядаўна нарадзілася. Ёй выдзелілі месца ў садку на вуліцы Набярэжная імя Ф. Скарыны, куды з мікрараёна Вулька трэба дабірацца грамадскім транспартам. Муж шматдзетнай маці працуе ваенным урачом, ён дапазна бывае на службе. А яна з немаўляткам на руках у перапоўненым транспарце не можа ездзіць і дома аднаго груднічка не пакінеш. «Проста фізічнай магчымасці няма вечарам забраць дзяцей з садка. Інакш і не прасіла б, не турбавала б», — гаворыць Наталля. Сапраўды, сітуацыя ў сям'і склалася няпростая. І губернатар папрасіў старшыню гарвыканкама Аляксандра Палышанкова паспрыяць шматдзетнай сям'і з садком, хоць бы ў парадку выключэння.

Як заўсёды, найбольш пытанняў і зваротаў датычылася будаўніцтва кватэр і індывідуальных дамоў. Індывідуальныя забудоўшчыкі наракалі на адставанне з узвядзеннем сетак і камунікацый у раёне забудовы. На пытанні найчасцей адказваў мэр горада — ён у курсе спраў кожнага з КІЗаў. Электрычнасць людзям паабяцалі ў першым паўгоддзі наступнага года, астатнія камунікацыі — па меры паступлення ў бюджэт сродкаў.

Два аднолькавыя пытанні паступілі з Іванаўскага раёна. Вяскоўцы цікавіліся: «Калі нам дазволяць гадаваць свіней на ўласных падворках?» Канстанцін Сумар прасіў гаспадынь з Ахова і Яечкавіч набрацца цярпення і пачакаць: няхай спачатку стабілізуецца сітуацыя, і тады ветэрынарныя службы здымуць забарону. А пакуль гаспадыням параілі гадаваць цялят. Прадаваць маладняк буйной рагатай жывёлы насельніцтву атрымалі распараджэнне кіраўнікі СВК там, дзе была праведзена работа па ліквідацыі прыватнага пагалоўя свіней.

Адзін з тэлефонных абанентаў узняў пытанне провадаў гараджан у апошні шлях. На яго думку, у абласным цэнтры недастаткова рытуальных зал, дзе можна было б арганізаваць годнае развітанне з нябожчыкам. Кіраўнік вобласці згадзіўся, што сёння ў Брэсце да тых рытуальных зал, што ёсць, можна дабавіць яшчэ адну. Гарвыканкаму паступіла ўказанне вывучыць гэта пытанне.

Некаторыя службовыя асобы тут жа атрымлівалі сур'ёзныя заўвагі. Як, напрыклад, з дарогай да месца індывідуальнай забудовы ў Бярозе. Дарогу падсыпалі, але слой чарназёму перад гэтым як след не знялі. Дождж прайшоў — і па дарозе нават будаўнічыя матэрыялы падвезці нельга, машына грэзне... Дарожная арганізацыя атрымала ўказанне выправіць сітуацыю цягам некалькіх дзён.

Даручэнні атрымалі і работнікі абласнога ўпраўлення адукацыі пасля званка з вёскі Красевічы Івацэвіцкага раёна. Групу школьнікаў з гэтай вёскі вазілі ў першай чвэрці школьным аўтобусам на заняткі па каратэ ў Косава. А потым перасталі вазіць. Бацькам так ніхто і не патлумачыў, што здарылася. А дзеці ўжо прывыклі да новай секцыі, ім падабаецца гэты від спорту. Вось і папрасіла бабуля аднаго з вучняў ад імя ўсіх удзельнікаў гуртка паспрыяць падвозу дзяцей у спартыўную школу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Парламенцкі дзённік

# ЛЕПШ ПАПЯРЭДЗІЦЬ, ЧЫМ ЛЯЧЫЦЬ

## Дэпутаты разгледзелі законапраект, які павінен перавесці айчынную сістэму аховы здароўя на іншы шлях

**Калі раней асноўнай функцыяй дзяржаўнай сістэмы аховы здароўя было лячэнне захворванняў, то праект закона аб унясенні змен і дапаўненняў у Закон «Аб ахове здароўя», які ўчора быў прыняты ў першым чытанні, пераарыентуе работу сістэмы на прафілактыку захворванняў. Аб гэтым казалі і распрацоўшчыкі законапраекта, і дэпутаты.**

### ПРАФАГЛЯД У ПРАЦОЎНЫМ ДАГАВОРЫ

— Хваробу лягчэй папярэдзіць, чым лячыць, — заўважыў на прэс-канферэнцыі, прысвечанай законапраекту, **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы Аляксандр ЦАЦОХА.** — Таму медыцынскія работнікі і дэпутаты ўзнялі пытанне пра тое, што прафілактыкай захворванняў павінен займацца не толькі ўрач, але і сам чалавек, працадаўца і мясцовыя органы ўлады. Пасля прыняцця закона будуць распрацаваны пэўныя міжведамасныя дакументы, якія прапішуць абавязкі кожнага.

Напрыклад, працоўны калектыў зможа прапанаваць працадаўцу вылучыць адзін дзень для праходжання прафілактычнага агляду, а таксама прадугледзець такое права і магчымасць у працоўным дагаворы. Дэталі ў законапраекце не прапісаны, але створана база, на падставе якой мяркуецца прыняць адпаведныя падзаконныя акты.

— Дзеючы закон не змяшчае падстаў на вылучэнне фінансавання для правядзення прафілактычных мерапрыемстваў для органаў мясцовай улады, — патлумачыў іншы выпадак **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы Валянцін МІЛАШЭЎСКІ.** — Цяпер такія падставы ёсць у законапраекце.

Міністэрства аховы здароўя мае намер давесці ўзровень дыспансерызацыі насельніцтва як мінімум да 94 працэнтаў, паведаміў журналістам **міністр аховы здароўя Васіль ЖАРКО.** Пакуль на дыспансерызацыю прыходзяць 60-70 працэнтаў беларусаў. Пры гэтым міністр упэўнены, што новыя захады, пры разумным іх правядзенні, не прывядуць да павелічэння чэргаў у паліклініках.

У праекце закона таксама прапісваюцца новыя віды аказання медыцынскай дапамогі (высокатэхналагічная, медыка-сацыяльная, паліятыўная), пашыраецца пералік умоў аказання медыцынскай дапамогі (аддзяленні дзённага прабывання, па-за арганізацыямі аховы здароўя).

### ПРАВА НА АДМОВУ

Змены ў Закон «Аб ахове здароўя» прадугледжваюць павышэнне ўзроставай планкі пры правядзенні стэрылізацыі мужчын і жанчын. Гэты метад кантрацэпцыі дазваляецца праводзіць у медыцынскіх установах па пісьмовай заяве пацыента ва ўзросце старэй за 35 гадоў альбо пры наяўнасці ў яго не менш за 2 дзяцей, а ў выпадку медыцынскіх паказанняў — незалежна ад узросту і наяўнасці дзяцей. У дзеючым законе няма падобных абмежаванняў для незваротнага спосабу кантрацэпцыі.

— У практыцы дастаткова выпадкаў, калі жанчына пасля стэрылізацыі ў маладым узросце вымушана была звяртацца да метаду ЭКА, бо жыццёвыя абставіны змяніліся і ўзнікла патрэба нарадзіць яшчэ дзіця, — патлумачыла неабходнасць увядзення ўзроставага абмежавання **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы Святлана ШЫЛАВА.** — Ёсць зваротныя метады кантрацэпцыі. Але я хачу сказаць, што на стэрылізацыю маюць права не толькі жанчына, але і мужчына. У свеце каля 1,5 мільёна мужчын выкарыстоўваюць гэты метад кантрацэпцыі, у Беларусі ж такіх няма.

Дакумент таксама прадугледжвае права ўрача на адмову ад правядзення аборту. Такая адмова будзе магчыма, калі гэта не пагражае жыццю або здароўю жанчыны, а таксама пры наяўнасці пісьмовага паведамлення кіраўніку арганізацыі аховы здароўя. Той, у сваю чаргу, павінен будзе арганізаваць правядзенне штучнага перарывання цяжарнасці іншым урачом-спецыялістам.

Акрамя таго, прапануецца ўстанавіць абавязак арганізацый аховы здароўя ствараць умовы для перадабортнага псіхалагічнага кансультавання жанчын, якія звярнуліся наконт правядзення штучнага перарывання цяжарнасці. «Такая мера будзе садзейнічаць зніжэнню колькасці абортаў і, як вынік, паляпшэнню дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне», — лічыць міністр аховы.

Законапраектам дапаўняецца пералік выпадкаў, калі ўрачэбная тайна можа быць выдадзена без згоды пацыента. «А менавіта па пісьмовым запыце органаў дазнання ў сувязі з правядзеннем экспертыз і вырашэннем пытання аб распачынанні крымінальнай справы, органаў унутраных спраў аб праходжанні медыцынскага агляду вадзіцелямі транспартнага сродку, наймальніка — у сувязі з правядзеннем расследавання няшчаснага выпадку на вытворчасці, з узнікненнем прафесійнага захворвання», — растлумачыў дэпутатам Васіль Жарко, дадаўшы, што ў асобных выпадках медыкі будуць адказваць на пісьмовыя запыты страхавых арганізацый.

### БЕЛАРУСКІ ЛАЎКОСТ

Палата прадстаўнікоў таксама разгледзела праект закона аб ратыфікацыі міжурадавага дагавора аб беларуска-латвійскай дзяржаўнай граніцы, які быў падпісаны 10 красавіка 2013 года ў Віцебску. 21 лістапада Латвійская Рэспубліка ратыфікавала дагавор. Дакумент вызначае парадак утрымання дзяржграніцы, парадак яе перасячэння і знаходжання ў пагранічных водах, парадак вядзення гаспадарчай дзейнасці на граніцы і іншае. Таксама ў дагаворы прапісана стварэнне сумеснай камісіі па пытаннях дзяржграніцы. Яе беларуская частка павінна быць сфарміравана пастановай Савета Міністраў. Дакумент павінен завяршыць працэс дагаворна-прававога афармлення беларуска-латвійскай граніцы.

У другім чытанні былі прыняты папраўкі ў Паветраны кодэкс Беларусі, якія, у прыватнасці, уводзяць так званыя незваротныя тарыфы (лаўкост). Гэта дасць магчымасць беларускім авіяцыйным арганізацыям ажыццяўляць гібкую тарыфную палітыку. З'явіцца нізкі цэнавы сегмент, а значыць, айчынны перавозчык стане больш канкурэнтаздольным у адносінах да замежных кампаній.

Пры гэтым дакладна вызначаецца, што колькасць дагавораў, заключаных з прымяненнем лаўкост, будзе не больш за 30 працэнтаў незваротных тарыфаў ад устаноўленых на маршруце паветранай перавозкі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■ Від на жыхарства

# ЧЫМ ЗААХВОЧВАЮЦЬ ПРАЦОЎНЫХ МІГРАНТАЎ?

**Мігранты ў Беларусі — гэта пераважна грамадзяне Расіі, Украіны і Казахстана. Грамадзяне Расіі і Казахстана, згодна з адпаведнымі дамоўленасцямі, фактычна могуць прэтэндаваць на працоўныя месцы на роўных правах з беларусамі. Як і беларусы — у гэтых краінах.**

— Паколькі ў нас ёсць складаныя ў дэмаграфічным сэнсе рэгіёны ў сельскай мясцовасці, то дзяржава імкнецца стымуляваць працаўладкаванне з пасяленнем менавіта ў такіх рэгіёнах, — кажа старшы інспектар па асаблівых даручэннях дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў Таццяна МЯЛЕШКА. — Закон «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ў Закон «Аб прававым становішчы замежных грамадзян» будзе прадугледжваць магчымасці аднаразовых выплат у памеры ад 5 да 10 базавых велічынь замежным грамадзянам і членам іх сем'яў, якія маюць намер жыць і працаваць у сельскай мясцовасці. Пад гэтую норму падпадае не больш за 1 працэнт замежнікаў. У Беларусі не толькі спрошчана працэдура атрымання дазволу на работу, але тым людзям, што маюць від на жыхарства, прадастаўляюцца яшчэ сацыяльныя гарантыі, якімі карыстаюцца і мясцовыя жыхары...

Калі замежнік укладвае ў інвестыцыйны праект 150 тысяч еўра, ён можа атрымаць від на жыхарства. Сёлета зафіксаваны 3 такія звароты — ад грамадзян Італіі, Турцыі і Малдовы. Наогул за час існавання такой нормы ў заканадаўстве не шмат чалавек атрымалі падобным чынам від на жыхарства.

«Крымінагенную сітуацыю замежныя грамадзяне не пагаршаюць, — адзначае Таццяна Мялешка. — Сёлета затрыманы некалькі невялікіх груп нелегальных мігрантаў з Афганістана, Сірыі, В'етнама... Наша краіна разглядаецца нелегальнымі мігрантамі як краіна-транзіт. Парушальнікі, вядома, падлягаюць дэпартацыі або высылцы. Парушэнне тэрміну забароны на ўезд у краіну цягне за сабой ужо крымінальную адказнасць — пазбаўленне волі тэрмінам да 3 гадоў. Як правіла, дзяржава не затрачвае ўласных сродкаў на дэпартацыю ці высылку. Гэта адбываецца ў першую чаргу за кошт парушальніка».

Што датычыцца міграцыі нашых грамадзян за межы краіны, то тут, на жаль, няма дакладных звестак. Згодна з афіцыйнай інфармацыяй, пачынаючы з 1990-х гадоў у Канаду, напрыклад, выехала менш за 2,5 тысячы чалавек, аднак у самой Канадзе зарэгістравана за той жа час звыш 10 тысяч беларускіх мігрантаў. Наогул у апошнія 5-7 гадоў каля 30-35 працэнтаў насельніцтва ўказваюць (у межах апытанняў) на наяўнасць міграцыйных настрояў, аднак на пастаяннае месца жыхарства хацелі б з'ехаць каля 15 працэнтаў і ўсяго 5 працэнтаў прымаюць канкрэтныя захады. Як правіла, гэта людзі з высокім сацыяльным статусам і добрай адукацыяй.

— Эміграцыя аказвае як негатыўнае, так і станоўчае ўздзеянне на дэмаграфічную сітуацыю Беларусі не толькі ў колькасным, але і ў якасным аспекце, — кажа аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Андрэй ЕЛІСЕЕЎ. — У той жа час, калі разглядаць толькі працоўную міграцыю з Беларусі, то, з аднаго боку, яна спрыяе дэфіцыту працоўных кадраў у такіх галінах эканомікі, як будаўніцтва, транспарт, камунальная гаспадарка... З другога — працоўныя мігранты набываюць дадатковы вопыт і навыкі, зніжаецца ўзровень беспрацоўя, а грашовыя пераводы ад мігрантаў паніжаюць узровень беднасці ў краіне і паляпшаюць плацежны баланс Беларусі.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ На кантролі

# І НАВОШТА КУПЛЯЛІ?

**Штрафныя санкцыі на агульную суму амаль 370 мільёнаў рублёў прад'яўлены Дзятлаўскім, Ваўкавыскім, Мастоўскім і Свіслацкім райвыканкамамі да 10 пакупнікоў аб'ектаў, якія дагэтуль былі ў дзяржаўнай уласнасці і не выкарыстоўваліся.**

Па 6 новых уласніках, чые абяцанкі даць «другое жыццё» пустуючым аб'ектам не спраўдзіліся, накіраваны матэрыялы ў гаспадарчы суд Гродзенскай вобласці для спагнання штрафных санкцый за невыкананне дагаворных умоў. Акрамя таго, Камітэтам дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці 4 нядобрасумленныя пакупнікі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці на агульную суму 80 мільёнаў рублёў. Па 25 аб'ектах дагаворы скасаваны і маёмасць вярнулі ў дзяржаўную ўласнасць.

Пры гэтым Камітэт дзяржкантролю звяртае ўвагу, што ў шэрагу раёнаў няма паэтапнага адсочвання тэрмінаў рэалізацыі дагавораў і, адпаведна, аператыўнага рэагавання на выпадкі, калі пакупнік не мае намеру ці магчымасцяў ажыццяўляць на гэтым аб'екце прадпрымальніцкую дзейнасць. Што робіць лёс такіх аб'ектаў яшчэ больш незайздросным — яны разбураюцца і канчаткова страчваюць прывабнасць для патэнцыяльных пакупнікоў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ДА НАС ЗНОЎ ІДЗЕ МАГУТНЫ «ХАВЕР»

**Гэтымі днямі на тэрыторыю Беларусі завітае магутны паўночнаатлантычны цыклон «Хавер», паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

Мацней за ўсё гэты цыклон, які рухаецца да нас праз акваторыю Балтыйскага мора, «ударыць» па паўночна-ўсходніх рэгіёнах Беларусі. Там чакаюцца снег, мяцеліца, а месцамі на дарогах галалёдзіца. Прагназуюцца парывы ветру да 15—24 метраў у секунду. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў.

Захаваюцца складаныя ўмовы надвор'я і ў суботу. Тэмпература паветра панізіцца: на працягу сутак будзе ад нуля да мінус 6 градусаў. Вецер у асобных раёнах пачне сціхаць, аднак месцамі яго парывы будуць дасягаць 15—20 м/с. Прагназуецца, што да нядзелі «Хавер» пакіне тэрыторыю Беларусі і будзе рухацца на Маскоўскую вобласць. У гэты дзень на большай частцы Беларусі пройдзе кароткачасовы снег, па паўднёвым захадзе месцамі «закруціць» мяцеліца. На дарогах захаваецца галалёдзіца. Уначы па паўднёвым захадзе краіны сіноптыкі прагназуюць узмацненне ветру з парывамі да 15—20 метраў у секунду. А вось тэмпература паветра працягне зніжацца: уначы да мінус 3—8 градусаў, удзень чакаецца ад нуля да мінус 6 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у пачатку наступнага тыдня захаваецца марознае надвор'е. У панядзелак тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 6 да мінус 12 градусаў, а пры праясненнях — да мінус 14 марозу. Удзень будзе мінус 2—8 градусаў, а трохі цяплей чакаецца па паўднёвым захадзе краіны, дзе ўначы прагназуецца ад 0 да мінус 5 градусаў, удзень — ад мінус 1 да плюс 2 градусаў. Уначы па заходнім рэгіёне, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны сіноптыкі абяцаюць снег, у паўднёва-заходніх раёнах — мокры снег. На асобных участках дарог — галалёдзіца.

## 16 БУЙНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ПАДРЫХТАВАЛІ ДА ПРЫВАТЫЗАЦЫІ?

**Павялічылася колькасць адкрытых акцыянерных таварыстваў, пераўтвораных з рэспубліканскіх унітарных прадпрыемстваў, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Дзяржкамітэта па маёмасці.**

Такім чынам, у адпаведнасці з планам пераўтварэння рэспубліканскіх унітарных прадпрыемстваў на 2011—2013 гады, зацверджаным пастановай Савета Міністраў краіны ад 21 сакавіка 2011г. № 348, па стане на 1 снежня, загадамі тэрытарыяльных фондаў дзяржаўнай маёмасці ў адкрытыя акцыянерныя таварыствы ператвораны 16 буйных рэспубліканскіх прадпрыемстваў.

У прыватнасці, гэта гомельскае навукова-даследчае ўнітарнае прадпрыемства «Прамень», мінскае мантажна-наладачнае прадпрыемства «Белэлектрамантажналадка», Гомельскі лікёра-гарэлачны завод, Хойніцкі завод гідраапаратуры, Веткаўская бавоўнапрадзільная фабрыка, Лепельскі электрамеханічны завод, авіякампанія «Гродна», Гомельскі завод спецінструмента і тэхналагічнага абсталявання, камбінат па вытворчасці медыцынскай і спіртавой прадукцыі «Этанол» у Мазыры і іншыя.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ГІМНАЗІЯДА І... АДРАЗУ РЭКОРД

**1 залаты, 2 сярэбраныя і 1 бронзавы медалі заваявалі беларускія школьнікі на XV Сусветнай гімназіядзе, якая завяршылася ў Бразіліі.**

Арганізуе і праводзіць спаборніцтвы, у якіх удзельнічаюць школьнікі ва ўзросце ад 14 да 17 гадоў, Міжнародная федэрацыя школьнага спорту (ISF). У яе ўваходзяць 67 краін свету. Беларусы, між іншым, прымалі ўдзел у сусветных спаборніцтвах упершыню. І адразу ўстанавілі рэкорд Сусветнай гімназіяды.

«Золата» ў кіданні кап'я заваявала вучаніца сталічнай гімназіі № 16, якая прадстаўляла спецыялізаваную дзіцяча-юнацкую школу алімпійскага рэзерву № 2 БФСА «Дынама» Ганна Тарасюк. Менавіта ёй належыць рэкорд Сусветнай гімназіяды — 57,95 м.

Сярэбраны медаль у скачках у вышыню заваяваў навучэнец сталічнай сярэдняй школы № 148, выхаванец Рэспубліканскай школы вышэйшага спартыўнага майстэрства па лёгкай атлетыцы Павел Селівёрстаў. Таксама сярэбраную ўзнагароду ў плаванні на 50 м на спіне атрымаў навучэнец Магілёўскага дзяржаўнага ліцэя № 3, выхаванец гарадской дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы Мікіта Цмыг.

А бронзавы медаль у бегу на 100 метраў з бар'ерамі ўручаны вучаніцы сярэдняй школы № 20 г. Орша, якая прадстаўляе Віцебскую абласную школу вышэйшага спартыўнага майстэрства, Святлане Губенка.

У праграму Сусветнай гімназіяды ўключаны такія летнія віды спорту, як спартыўная і мастацкая гімнастыка (індывідуальныя і камандныя спаборніцтвы), аэробіка, плаванне і лёгкая атлетыка. Дэлегацыю Беларусі на спаборніцтвах прадстаўлялі ўдзельнікі і пераможцы Рэспубліканскай спартакіяды школьнікаў 2013 года ў двух відах спорту — плаванні і лёгкай атлетыцы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## АБВЕШЧАНЫ ГАСПАДАРЫ ЛЕПШЫХ АГРАСЯДЗІБ

**Вызначыліся пераможцы рэспубліканскага конкурсу Белаграпрамбанка «Лепшая аграэкасядзіба 2012 года».**

Гаспадары сядзібных комплексаў з усёй Беларусі змагаліся ў пяці намінацыях. У выніку Гран-пры конкурсу ў намінацыі «Стыль і гармонія» дасталося сядзібе «Купалінка», што ў Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці. У гэтай жа катэгорыі журы адзначыла маёнтак «Бівак» з Барысаўскага раёна. Таксама перамогу атрымалі сядзібы «Славяначка» (Наваполацк, намінацыя «Гасціннасць»), «Марчукова хата» (Шчучынскі раён, «Захаванне беларускіх традыцый»), «Глівінская» (Барысаўскі раён, «Здаровы лад жыцця»), «У Нінэль» (Лёзненскі раён, «Экасядзіба года»). Конкурс «Лепшая аграэкасядзіба года» праходзіў ужо пяты раз.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

## ЗА ПРАЕЗД ПА ПЛАТНЫХ ДАРОГАХ — ЯШЧЭ АДНОЙ КАРТКАЙ

**Пашыраны пералік паліўных картак, пры дапамозе якіх можна аплачваць праезд па платных аўтамабільных дарогах.**

У прэс-службе Міністэрства транспарту і камунікацый нагадалі, што ў адпаведнасці з дзеючай з чэрвеня пастановай міністэрства «Аб устанаўленні пераліку паліўных картак, праз якія бярэцца плата за праезд транспартных сродкаў па платных аўтамабільных дарогах у рэжыме аплаты па факце, перадаплаты і залогавы кошт устройства электроннай аплаты» ёсць магчымасць аплаты за праезд пры дапамозе паліўных картак двума спосабамі. Першы — пры афармленні дагавора перадаплаты, які ў асноўным выкарыстоўваецца для легкавых аўтамабіляў ці арганізацый з паркам машын да 5 адзінак. Другі варыянт — заключэнне дагавора ў рэжыме аплаты па факце, калі адзін дагавор заключаецца на ўвесь парк аўтамабіляў і няма неабходнасці папаўняць рахунак. Адначасова з гэтым магчыма праводзіць аплату як за паліва, так і за праезд па платных дарогах. Цяпер у вышэйназваны дакумент унесены змяненні.

Для пашырэння спосабаў аплаты за праезд карыстальнікамі платных аўтамабільных дарог канцэрн «Белнафтахім» правёў тэхнічныя дапрацоўкі і ўстаноўку праграмнага забеспячэння, якія дазваляюць зараз праводзіць плацежныя аперацыі па паліўных картах «Беларуснафта» ў рэжыме аплаты па факце.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ВАРТАЎНІК ДЗІЦЯЧАГА САДКА «ЦІСНУЎ» САМАГОН

**Падпольную вытворчасць грамадзянін арганізаваў у сябе дома. Пра гэтае захапленне мужчыны яўна сведчыў спецыфічны пах у пад'ездзе.**

— Калі нашы ўчастковыя інспектары разам з супрацоўнікамі раённага аддзела дэпартамента аховы наведаліся да самагоншчыка дадому, працэс, як той казаў, быў у самым разгары. Паколькі «вытворчыя магутнасці» былі абсталяваны на кухні, нешта адмаўляць гаспадару было бессэнсоўна, — паведаміла прэс-афіцэр Першамайскага РУУС г.Мінска Святлана Білінская. — Падчас агляду жылля вартаўніка дзіцячага садка міліцыянеры канфіскавалі 25 літраў брагі, літр самагону і ўласна сам апарат. Як патлумачыў гаспадар, уся прадукцыя прызначалася для ўласнага спажывання, а не для продажу. Тым не менш вынікам такой падпольнай дзейнасці стаў пратакол, згодна з якім грамадзяніну пагражае штраф да 30 базавых велічынь. Дарэчы, з пачатку года толькі ў Першамайскім раёне сталіцы канфіскавана каля 8 тысяч літраў самагону і брагі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання Кульшы Ніне Герасімаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МУЖА.**

Бланк страхового полиса ББ № 0238141, принадлежащий ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», **считать утерянным.** УНП 101063229

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ «КУЛЬТУРНАЙ СТАЛІЦЫ»

**9 снежня Магілёў афіцыйна передае званне культурнай сталіцы СНД кіргізскаму гораду Ош і казахскаму Алматы. А эстафету культурнай сталіцы Беларусі прымае на гэты раз старадаўняе Гродна. З гэтай нагоды ў Магілёве пройдуць ўрачыстыя мерапрыемствы, адкрыецца выстава-прэзентацыя «Магілёў — культурныя традыцыі: ад мінулага да сучаснасці», адбудзецца вялікі гала-канцэрт. У гонар таго, што горад на працягу года быў цэнтрам культурнага жыцця, на плошчы каля гарвыканкама з'явіцца адмысловы памятны знак. Пра тое, што з запланаванага ўдалося здзейсніць, а што засталося «за кадрам», наша гаворка з начальнікам галоўнага ўпраўлення па ідэалагічнай рабоце, культуры і справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Анатолем СІНКАЎЦОМ.**



**— Анатоль Анатольевіч, наколькі адказна было Магілёву адпавядаць адначасова статусу культурнай сталіцы Беларусі і краін СНД?**

— Магілёў — другі горад у Беларусі пасля Гомеля, які атрымаў такі высокі статус. Улічвалася яго гісторыя, традыцыі, побыт. А канцэрты і культурныя падзеі — гэта прыгожы дадатак да таго, чым багаты наш горад. Званне «культурная сталіца» — гэта нешта накшталт брэнда. Вы бачылі, колькі сёлета было гасцей фестывалю «Залаты шлягер»? Яны ехалі ў Магілёў менавіта як у культурную сталіцу. Для нас было вельмі ганарова несці такі высокі статус. Памятны знак, які зрабіў вядомы магілёўскі скульптар Андрэй Вараб'ёў, стане сімвалам гэтай значнай падзеі ў жыцці Магілёва.

**— Год быў вельмі багаты на розныя культурныя падзеі. Якую падтрымку ў гэтым аказала Саюзная дзяржава?**

— Саюзная дзяржава, за што ёй вялікі дзякуй, дапамагла ў шматлікіх праектах. Сёлета мы пашырылі межы міжнароднага пленэру па жывапісе «Вобраз Радзімы ў выяўленчым мастацтве». Упершыню адбыўся абмен юнымі мастакамі: спачатку да нас прыехалі 15 хлопчыкаў і дзяўчат з Расіі, а потым нашы дзеці працавалі ў музеі-запаведніку імя Паленава ў Тульскай вобласці. І гэта толькі адзін прыклад. Разам з калегамі са Смаленска мы аднавілі сцэнічныя і бытавыя касцюмы. Цяпер мы адзіныя ў рэспубліцы маем касцюмы ўсіх рэгіёнаў вобласці і Магілёва. У іх арнаментах зашыфраваная найкаштоўнейшая інфармацыя, па якой нашы продкі вызначалі, адкуль прыехаў чалавек.

**— Чула, што менавіта статус культурнай сталіцы падштурхнуў да ідэі стварэння пры абласным мастацкім музеі імя Паўла Масленікава майстэрні для моладзі.**

— Так. І як сведчаць вынікі анкетавання гараджан, гэтая майстэрня вельмі запатрабавана. Творчая лабараторыя па жывапісе запрацуе ўжо са студзеня. Яна размесціцца ў майстэрні Паўла Васільевіча Масленікава, дзе знаходзяцца яго рэчы, у тым ліку мальберт і фарбы. А галоўнае, тут захавалася энергетыка вялікага майстра, яго аўра. Усё гэта, я ўпэўнены, будзе падымаць творчы дух нашых юных мастакоў. Вядомыя майстры будуць даваць для іх майстар-класы. Ужо ёсць дамоўленасць з народным мастаком Расіі Юрыем Кугачам, выстава якога запланавана на 14 студзеня. Статус «культурная сталіца» падштурхнуў нас да ідэі стварыць і іншыя творчыя лабараторыі: харэографаў і музычных дзеячаў.

> **Для нас было вельмі ганарова несці такі высокі статус. Памятны знак, які зрабіў вядомы магілёўскі скульптар Андрэй Вараб'ёў, стане сімвалам гэтай значнай падзеі ў жыцці Магілёва.**

**— Як рэалізуецца праект па падтрымцы маладых талентаў Магілёўшчыны?**

— Вялікую папулярнасць мае рэспубліканскі праект «Акадэмія талентаў». Падобны да яго працуе ў нас пры прадзюсарскім цэнтры абласной філармоніі. Кіраўнік аркестра народных інструментаў Мікалай Алданаў выязджае ў раёны і адбірае таленавітых дзяцей. Калі яны выступаюць разам з аркестрам, адчуваеш, які гэта пазітыўны рух уперад.

**— Сёлета магілёўскі тэатр лялек атрымаў Гран-пры міжнароднага фестывалю «М@рт.кантакт»…**

— Спектакль «Гамлет», які паставіў наш тэатр лялек, не толькі ўсхваляваў тое міжнароднае журы, якое ўручыла яму Гран-пры тэатральнага фестывалю, але ўскалыхнуў і далёкае замежжа. Мы атрымалі запрашэнне нават з Вялікабрытаніі. Не так даўно тэатр вярнуўся з Польшчы, дзе атрымаў высокую ацэнку гэтай пастаноўкі, трупу запрашаюць усе вобласці краіны. Малады галоўны рэжысёр тэатра Ігар Казакоў вельмі таленавіты, у яго шмат цікавых ідэй. Дарэчы, гэты тэатр адзіны ў вобласці, дзе ёсць пакой для малых дзяцей, якія знаходзяцца там, пакуль іх бацькі глядзяць пастаноўку. Яны становяцца ўдзельнікамі тэатральнай гульні, з імі працуюць акцёры. І білеты туды раскупляюцца ў адно імгненне.

**— А моладзевы рух «Ленінская-online», які ініцыюе правядзенне ў Магілёве розных цікавых мерапрыемстваў, вы неяк падтрымліваеце?**

— Мы сёння ўзялі пад сваё крыло ўсе фармальныя і нефармальныя аб'яднанні. Быў час, калі моладзь захаплялася брэйкдансам і збіралася на нейкіх выпадковых пляцоўках. Мы правялі адкрыты дыялог з прадстаўнікамі гэтага руху. Цяпер усё легалізавана. Мы гатовы ісці насустрач.

**— А што не атрымалася зрабіць за гэты год?**

— Не атрымалася зрабіць вялікую канцэртную залу. З гэтай прапановай да нас звярнуліся жыхары Магілёва. Мы разлічвалі на фінансавую падтрымку, але пакуль пытанне застаецца адкрытым. Тым не менш мясцовае кіраўніцтва таксама зацікаўлена ў гэтым. Разам з тым, нам не хапае вялікай сцэны і для канцэртаў «Залатога шлягера». Сёння над гэтай ідэяй працуюць архітэктары горада.

Магілёўцы вельмі ўдзячныя за тое, што ў горадзе з'явіўся філіял Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы і балета, што яны маюць магчымасць дакрануцца да вялікага мастацтва.

**— На жаль, Магілёў не можа пахваліцца і тым, што мае шмат помнікаў…**

— Мы ўжо не першы год працуем над тым, каб увекавечыць памяць герояў магілёўскай абароны палкоўніка Сямёна Куцепава і генерала Міхаіла Раманава, а таксама пісьменніка Канстанціна Сіманава. Стварэнне мемарыяльнага ансамбля на Буйніцкім полі было запланавана яшчэ ў 2009 годзе. Ідэя належыць ветэранам Магілёва, якія пажадалі, каб подзвіг герояў 172-ой стралковай дывізіі, якая ў 1941 годзе першая прыняла ўдар нямецкіх танкаў на сябе, быў ушанаваны. Гэты праект ацэньваўся ў 2 мільярды рублёў. Ажыццявіць задуманае планавалася за кошт сродкаў Саюзнай дзяржавы. Ідэю нават падтрымаў кіраўнік фракцыі Дзяржаўнай Думы Федэральнага сходу Расіі Генадзь Зюганаў, аб чым абвясціў Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы. Магілёўскія ветэраны атрымалі абнадзейліваe пісьмо, дзе растлумачваўся парадак арганізацыі фінансавання. Але праз некалькі гадоў у фінансаванні гэтага помніка адмовілі. Гэтае пытанне падымалася неаднойчы, але пакуль што засталося нявырашаным. Усё ўпіраецца ў грошы. Калі б не гэта, то мы з задавальненнем увекавечылі б не толькі герояў вайны, але і іншых нашых дзеячаў. Напрыклад, таго ж Дэмбавецкага. Гэты губернатар шмат што зрабіў для нашай вобласці. Але сёння помнік каштуе вялікіх грошай. Калі грамадства прыме ўдзел у зборы сродкаў, то гэтую задачу будзе лягчэй выканаць.

**— У вобласці даўно праводзіцца даволі рэдкі фестываль па кераміцы «Арт-Жыжаль». На яго прыязджаюць удзельнікі нават з далёкага замежжа. Гаворка аб стварэнні музея керамікі ў Бабруйску вядзецца ўжо не першы год. Але ён да сённяшняга дня так і не быў створаны.**

— Сам калісьці стаяў каля вытокаў адкрыцця названага фестывалю, таму для мяне гэта справа прынцыпу. Калекцыя работ «Арт-Жыжаля» вельмі багатая. Сёння ніводная краіна ў свеце не можа гэтым пахваліцца. Самае галоўнае дасягненне фестывалю ў тым, што ён аднавіў забытыя традыцыі нашых продкаў і передае іх маладому пакаленню. Сёння вядуцца перамовы з мэрам Бабруйска аб тым, каб пад музей быў аддадзены адзін з бастыёнаў Бабруйскай крэпасці. У наступным годзе пачнецца распрацоўка дакументацыі для адкрыцця гэтага музея. Гэтае пытанне абавязкова будзе вырашацца. Мы павінны захаваць каштоўную спадчыну для нашчадкаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**



**Навукоўцы Беларусі, заклапочаныя захаваннем важных для нашай экалогіі біятопаў — лясоў, балот, азёр і рэк — сабралі багаты матэрыял для выдання кнігі-даведніка «Рэдкія біятопы Беларусі». Іх памкненні падтрымалі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі, Праграма развіцця ААН, Глабальны экалагічны фонд, Праект «Біяразнастайнасць», Інстытут эксперыментальнай батанікі Акадэміі Навук Беларусі. У кнізе прадстаўлены 43 катэгорыі беларускіх біятопаў, якія маюць міжнароднае і нацыянальнае значэнне.**

# УНІКАЛЬНАЯ КНІГА БІЯТОПАЎ



— Выданне стане важным інструментам фарміравання нацыянальнай практыкі аховы біятопаў, а таксама выканання патрабаванняў Бернскай канвенцыі, якую падпісала і Беларусь, — гэтая думка прагучала ў час прэзентацыі кнігі, якая прайшла ў сценах Нацыянальнага мастацкага музея ў Мінску. У прэзентацыі выдання ўзялі ўдзел прадстаўнік ААН / ПРААН у Беларусі Санака Самарасінха, намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ігар Качаноўскі.

Паколькі сёлета спаўняецца 45 гадоў надання ахоўнага статусу аднаму з унікальных біятопаў Еўропы — балоту Ельня, да прэзентацыі кнігі было прымеркавана і адкрыццё фотавыстаўкі «Балота Ельня. 9000 гадоў прыгажосці». Аўтарам не толькі прыгожых, але і рэдкіх кадраў з'яўляецца фатограф з пасёлка Шаркаўшчына Валерый Кавалёнак.

На фотаздымку ўдзельнікі аўтарскага калектыву кнігі-даведніка «Рэдкія біятопы Беларусі» Аляксандр Пугачэўскі, Ігар Рудакоўскі і Максім Ярмохін. Экспазіцыя фотаздымкаў з Ельні Валерыя Кавалёнка.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

## ■ У эфіры

# XXL — ФАРМАТ ДЛЯ ЎСІХ ПАМЕРАЎ

**Тэлеканал «Беларусь-1» прыступіў да выпуску новага глянцавага часопіса «XXLwomanTV». Пад «вокладкай» — мода і здароўе, догляд сябе і выхаванне дзяцей, культурныя мерапрыемствы і падзеі свецкага жыцця — карацей, усе тэмы, якія цікавяць сучасных жанчын і не толькі іх.**



Фота прэс-службы БТРК.

Вядуць праграму спявачка, салістка прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» Алена Ланская, для якой праца па той бок экрана — гэта новы вопыт, і добра знаёмы гледачам па праграме «Добрай раніцы, Беларусь!» Глеб Давыдаў. А гасцямі першых выпускаў тэлечасопіса сталі Аляксей Хлястоў і Іна Афанасьева.

Дарэчы, у тэлевізійных кулуарах «XXLwomanTV» называюць аналагам праграмы «Культурныя людзі». Нагадаем, гэта праграма, якую стварыла і вяла эфектная брунетка Аліна Краўцова, 5 гадоў была галоўным тэлегідам па культурных падзеях Беларусі і нават атрымала прафесійную прэмію «Тэлевяршыня». Яе спадкаемца — «Культурныя людзі+» з Дзмітрыем Кахно і спявачкай Наталляй Лук'янцавай — пратрымаўся ў эфіры ўсяго адзін сезон. Якім атрымаецца трэці пераемнік, пакажа час. Пакуль жа вядучыя новай праграмы прызначаюць спатканне гледачам кожную нядзелю пасля поўдня.

**Калі**: 8 снежня, 13.15.

**Дзе**: «Беларусь-1».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

## ■ Медыяпрастора

| | | | |
|---|---|---|---|
| Брэст | 106.6 FM | Бабруйск | 103.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM | Баранавічы | 98.4 FM |
| Мінск | 107.1 FM | Салігорск | 104.3 FM |
| Гродна | 104.2 FM | Пінск | 103.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM | | |

## «МІРАВЫ» ТАНЦПОЛ»

**«МІРавы» танцпол» — гэта больш чым проста танцавальны праект! Гэта бура эмоцый, непадробны драйв і сапраўдны мегаадрыў!**

Аўтар і вядучая праекта DJ Каця Іўліева ў гадзінным dance-міксе круціць толькі лепшыя і адборныя хіты славутых дыджэяў планеты. Па-майстэрску зведзеныя паміж сабой трэкі з жывымі і энергетычна запраўленымі каментарыямі вядучай зададуць правільны тэмп для вашага добрага адпачынку і ўдалых выхадных.

Кожную пятніцу і суботу ў 22.00 далучайцеся да радыё «Мір» і падрыхтуйцеся атрымаць добрую дозу выдатнага настрою і непаўторнага руху. Жыві ў рытме з усім светам на «МІРнай» хвалі!

ЗВЯЗДА. Да чытача з любоўю!

**Працягваецца падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2014 года!**

**Шаноўныя сябры!**

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым калядным падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.**

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы | 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| **63850** (для індывідуальных падпісчыкаў) | 47 500 | 142 500 | 285 000 |
| **63145** (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 42 750 | 128 250 | 256 500 |
| **63858** (для ведамасных падпісчыкаў) | 95 300 | 285 900 | 571 800 |
| **63239** (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 85 800 | 257 400 | 514 800 |

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 9 СНЕЖНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.05** Зона X.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.00 Камедыя «Астэрыкс і Абелікс. Місія «Клеапатра».**
**12.10, 14.55, 18.35** Evrovision. Без каментарыяў.
**12.15** Дзень у вялікім горадзе.
**13.25** Клуб рэдактараў.
**14.10** Вакол планеты.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Журналісцкае расследаванне.
**15.55** Заўтра — гэта мы!
**16.25** Усё як трэба!
**16.50** Мюзікл «Залатая Рыбка».
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Сваты-6». 1-я серыя.**
**22.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**23.45** Дзень спорту.
**23.55 Трылер «Сустрэчнае расследаванне».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Я — целаахоўнік».**
**10.10** Навіны надвор'я.
**10.45, 23.40 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».**
**12.25** Дак. фільм «Цярновыя вянкі Алімпа».
**12.55 Камедыя «Паласаты рэйс».**
**14.40 Баявік «Затура: касмічная прыгода».**
**16.40** Беларуская часінка.
**18.55 Серыял «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава» . 1-я і 2-я серыі.**
**21.25** КЕНО.
**21.30 Серыял «Інтэрны».**
**22.35 Серыял «Рэальныя хлопцы».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30** «Дабраранак».
**8.00, 12.05, 18.40, 0.10** «Калейдаскоп».
**8.05, 12.10, 0.15** «Год у гісторыі».
**8.20** «Цуды прыроды». Чэхія. Куба. Фіджы.
**8.55** «Камертон». Піяніст Сяргей Тарасаў.
**9.20** «Палескі пачастунак». Салёная сала.
**9.35 Маст. фільм «Раскол».**
**10.20, 22.05** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.50 «Тры таварышы». Маст. фільм.**
**12.25, 23.45** «Святло далёкай зоркі». Памяці Пятра Падкавырава.
**12.55, 23.15** «Аўтограф».
**13.20** «Сінематэка». Аляксандр Яфрэмаў.
**14.05** «Карані».
**14.35** «Свет прыроды».
**14.45** «Пейзажы скрозь час». Ван Гог.
**15.15 «Рэйнджар з атамнай зоны». Маст. фільм.**
**16.40** «Наперад у мінулае».
**17.10** «Летуценні Я. Драздовіча».
**17.30** «Росчырк часу». Касцёл Святога Станіслава ў Магілёве.
**17.50** «Лабірынты».
**18.50 «Валерый Чкалаў». Маст. фільм.**
**20.30** Калыханка.
**20.45 «Давай пажэнімся». Маст. фільм.**
**22.30 Серыял «Замах». 1-я серыя.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Фулхэм» — «Астан Віла».
**9.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Арсенал» — «Эвертон».
**11.45, 14.35** Біятлон. Хохфільцэн. Гонка праследавання.
**12.45** Хакей. КХЛ. «Адмірал» — «Дынама» (Мінск).
**15.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Сандэрленд» — «Тотэнхэм».
**17.35** Баскетбол. Ліга ВТБ. ЦСКА — «Чырвоны Кастрычнік».
**19.20** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. СКА — «Дынама» (Мінск).
**20.55** Авертайм.
**21.25** Фактар сілы.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Суонсі» — «Хал Сіці».

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Закрытая школа».**
**12.10** «Яны і мы».
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Гісторыя Беларусі. Ірландскі след».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05 Трылер «Сотавы».**
**23.50** «Вячэрні Ургант».
**0.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Меншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Такі лёс».
**12.30** «Джэймі ў сябе дома».
**13.00** «Глядзець усім!».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг». Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў».
**15.45** «100 працэнтаў».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Па законе».
**18.30** «Вялікія тайны. Храмы багоў».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Фантастыка «Ультрафіялет».**
**22.00** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**23.00** «Ваенная тайна».
**0.40 Серыял «Знахар».**

### МІР

**5.00 Серыял «Пяць хвілін да метро».**
**6.35** М/ф.
**7.05** «Цік-так».
**7.20 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.15 Маст. фільм «Якой шанцуе».**
**10.35, 0.40** «Па-руску кажучы...».
**11.00** «Разам».
**11.45** «Агульны рынак».
**12.25, 2.30 Серыял «Клон».**
**14.10** Дак. фільм «У свеце мінулага».
**15.20, 22.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.20 Серыял «Жаночы раман».**
**18.25** «Беларусь сёння».
**19.00 Серыял «Паляванне на ізюбра».**
**21.25** «Акцэнты».
**21.40, 4.10** Дак. фільм «Рэальны свет».
**23.00 Серыял «Красная плошча».**
**1.05 Маст. фільм «Не прывыкайце да цудаў».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя@пошта».
**12.00** «Прамы эфір».
**13.00** «Шукальнікі».
**13.50, 16.50, 19.50, 0.35** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «1000 дробязяў».
**15.10** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.55** «Асаблівы выпадак».
**17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.05 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**18.55, 20.40 Серыял «Востраў непатрэбных людзей».**
**21.45 Серыял «Браты па абмене».**
**23.35 Серыял «Тайны следства».**
**0.45** «Шыфры нашага цела. Сэрца».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40** «Новыя рускія сенсацыі».
**9.35, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Серыял «Вышук-2».**
**23.05** Сёння. Вынікі.
**23.30** «Асноўны закон».
**0.30** «Песня для Вашага століка».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.10, 18.55, 21.05, 23.50** «Надвор'е».
**7.05** «На рыбалку».
**7.20, 14.25 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**9.00, 17.30 Серыял «Касл».**
**10.25 «Сінематограф». Маст. фільм «Дрэнная слава».**
**12.15 Драма «Паляўнічыя на гангстараў».**
**14.10** «Кінаблакнот».
**16.00** Мультпарад.
**16.15** «Мой любімы гадаванец».
**16.45 Серыял «Пякельныя коткі».**
**19.00 Серыял «Удар у адказ».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Драма «Халодная гара».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 17.30** «С.У.П.».
**9.00, 20.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».**
**10.00** «Шчасце без ахвяр».
**11.00, 22.20 Серыял «Маргоша».**
**12.00, 21.10 Серыял «Маладзёжка».**
**13.00, 16.30** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.30, 23.30** «Аўташкола».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00, 18.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**19.00 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**0.00** «Дарожныя войны».
**0.30** «Ч.П?».

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.40, 18.30, 22.15** Навіны культуры.
**9.15** «Наглядальнік».
**10.15 Маст. фільм «Яны ішлі на ўсход».**
**12.35, 1.30** Дак. фільм «Леў Гумілёў. Пераадоленне хаосу».
**13.05, 21.30 Серыял «У крузе першым».**
**13.45, 20.30** «Сусветныя скарбы культуры».
**14.00** Дак. фільм «Яго правасхадзіцельства таварыш Бахрушын».
**14.50 Маст. фільм «З вечара да паўдня».**
**17.05** Барыс Беразоўскі і Брыжыт Анжэрэр. Фартэпіянныя дуэты.
**17.35** Дак. фільм «Аляксандр Пятроў. Майстэрства на кончыках пальцаў».
**18.45** Галоўная роля.
**19.05** «Саці. Нясумная класіка...».
**19.45** Дак. фільм «Спіс Кісялёва. Выратаваныя з пекла».
**20.45** «Тым часам».
**22.35 Маст. фільм «Вавілон XX».**
**0.20** Хібла Герзмава. Вакальныя мініяцюры «на біс».
**0.40** Дак. фільм «Два жыцці. Наталля Макарава».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Быў час». 2008 год.
**6.10** Сустрэча ў «Астанкіне» з Міхаілам Задорнавым. 1992 год.
**7.25** «Муз-Эка-90». Памяці Джона Ленана. 1990 год.
**9.00** «Казачнае падарожжа містэра Більбо Бегінса, Хобіта праз дзікі край, чорны лес, за туманныя горы. Туды і назад». Фільм-спектакль. 1984 год.
**10.10** «Музыка ў эфіры». Зоркі англійскага рока. 1994 год.
**11.00** «Сузор'е «Авацыя» ў Ялце». Канцэрт. 1991 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.05** «Ноч-90». Канцэрт.
**14.10** «У коле сяброў. Вас запрашае Эльдар Разанаў». 1986 год.
**16.10** «Поле цудаў». 1992 год.
**17.00** «Марафон-15 — малым». 1993 год.
**17.30** «Карнавал». Фільм-канцэрт.
**18.00** «Брава, краіна Саветаў!». Дак. фільм.
**18.40 «Расказы пра Кешку і яго сяброў». 1-я серыя. Маст. фільм.**
**20.00, 2.00** «Час».
**21.00** «Народжаны ў СССР».
**22.00** «Спяём, сябры!». Канцэрт. 1989 год. 1-я частка.
**23.00** «Міжнародная панарама». 1980 год.
**23.55** «Майкл Джэксан у Маскве». Дак. фільм.
**0.30** «Выпадак з палкоўнікам Дарвінам». Тэлеспектакль. 1985 год.
**1.45** «Добрай ночы, малыя».
**4.00** «Кінапанарама». 1991 год.

### EUROSPORT

**10.30, 13.30, 1.50** Горныя лыжы. Кубак свету.
**11.30, 16.30** Снукер. Чэмпіянат Брытаніі. Фінал.
**14.15, 20.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету.
**15.00** Конны спорт. Еўрапейскі мастэрс.
**17.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-17). Фінал.
**19.30, 0.45** Футбол. Еўрагалы.
**20.30, 0.30** Футбол. Бразілеманія.
**21.30** Скачкі на лыжах. Кубак свету.
**22.45** Вось гэта дзіва!!!
**23.00** Пра рэслінг.
**1.45** Спорт і Ко.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 2.20** Серыял «Доўга і шчасліва».
**6.00, 8.45, 12.40, 13.45, 16.45, 21.50, 23.50, 3.05** «Камедыянты. Лепшае».
**6.15** Камедыя «Гары і Хендэрсаны».
**9.00, 0.10** Фантастыка «Прышэльцы 2: калідоры часу».
**11.15** Камедыя «Тры дні з дурнем».
**14.10** Прыгоды «Янкі пры двары караля Артура».
**17.20** Баявік «Два нулі».
**19.20** Камедыя «Хлапечнік».
**21.00** Серыял «Месячны хлопчык». 1-я серыя.
**22.10** Камедыя «Фантоцы 2000: кланіраванне».
**3.25** Мюзікл «Двайныя непрыемнасці».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30, 18.30, 2.55** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**10.15** «Паненка і кулінар».
**10.45, 17.00** Дак. серыял «Паралельны свет».
**11.45, 16.00** Дак. серыял «Варажбітка».
**12.45, 18.00** Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**13.10** «Жонка». Дар'я Данцова.
**14.30** «Сто пытанняў даросламу». Ала Сігалава.
**15.15, 0.15, 5.15** Серыял «Звышнатуральнае».
**20.30** Серыял «М.У.Р».
**21.30, 4.25** Серыял «Апошняя сустрэча».
**22.30** Маст. фільм «Ціхая».
**1.00** Серыял «Быць чалавекам».
**2.00** «Часова даступны». Людміла Максакава.

### ТБ1000

**5.00, 13.00** Камедыя «СМСуальнасць».
**7.00** Драма «Кастрычніцкае неба».
**9.00** Драма «Брацтва танца».
**11.00** Трылер «Вогненная сцяна».
**14.40** Камедыя «Слава».
**16.50** Трагікамедыя «Кірмаш ганарыстасці».
**19.15** Трылер «Ідэальны незнаёмец».
**21.10** Драма «Што хавае хлусня».
**23.00** Драма «Дрэва».
**1.00** Драма «Скарб».
**3.00** Трылер «Паляўнічы на забойцаў».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Драма «Жыві і памятай».
**8.00** Камедыя «Правадыр разнаскурых».
**10.00** Камедыя «Дзень радыё».
**12.00** Драма «Хлопцы».
**14.00** Трагікамедыя «Неадэкватныя людзі».
**16.00** Трылер «Цёмны свет».
**18.00** Камедыя «Скарбы О.К.»
**20.00** Камедыя «All Inclusive, або Усё ўключана».
**22.00** Драма «Князёўна Меры».
**0.00** Меладрама «Байкер».
**2.00** Меладрама «Гувернантка».
**4.00** Меладрама «Прагулка».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 19.00** Расследаванні авіякатастроф.
**6.00, 16.00** Сесар Мілан: Важак зграі.
**7.00** Прыручыць дракона.
**8.00, 13.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**9.00, 14.00** Злавіць сома.
**10.00** Мегазаводы.
**11.00** Аферысты і турысты.
**12.00** Пазнайце свой мозг.
**15.00** Гіганцкая панда.
**17.00, 2.00** Зусім сакрэтна.
**18.00** Шукальнікі скарбаў.
**20.00, 0.00, 3.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**21.00, 1.00, 4.00** Амерыканская мафія.
**22.00** Тайны гісторыі.
**23.00** Турэмныя цяжкасці.

### DISCOVERY

**7.00, 16.25** Хлопцы з Юкона.
**7.50** Беар над Эверэстам.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 17.20** Паляўнічыя на склады.
**10.30** Скрозь кратовую нару.
**11.25, 3.55** Разбуральнікі легенд.
**12.20, 21.00, 3.05** Выжыць разам.
**13.15, 5.10** Хуткія і гучныя.
**14.10, 6.05** Махінатары.
**15.30** Зброя па-амерыканску.
**18.15** Не спрабуйце паўтарыць.
**19.10** Геній распрацовак.
**22.00** Беар Грылс: выбрацца жывым.
**23.00** Правілы пазадарожнага руху.
**0.00** Як уладкаваны Сусвет.
**0.55** Top Gear ЗША.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

■ Асоба

# ВЕЧНА МАЛАДЫ АНДРЭЙ ЗАСПІЦКІ

**Неўзабаве найстарэйшы скульптар Беларусі Андрэй Заспіцкі адзначыць свой 90-гадовы юбілей. Пра гэтага чалавека сапраўды можна сказаць, што жыццё прайшло недарэмна. Яго творы ўпрыгожваюць мінскія вуліцы: ля іх мы ўскладаем кветкі, сустракаемся падчас спатканняў, а часам проста праходзім міма, быццам не заўважаючы, але ўсё роўна ведаем, што яны ёсць. Помнікі Максіму Горкаму і Янку Купалу ў аднайменных парках, Міцкевічу, Цыялкоўскаму, Глебаву... Уся Беларусь пакланяецца яго героям: Скарыну — у Полацку, Настассі Купрыянавай — у Жодзіне, Цётцы — у Астрыне, на яе радзіме...**

Сціплая майстэрня ў адным з раёнаў Мінска. Менавіта тут стварае свае шэдэўры заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Нягледзячы на свой узрост, майстар-самавук па-ранейшаму ў страі. Толькі скончыў ляпіць Міхаіла Савіцкага, як ужо завіхаецца ля бюста галоўнага дырыжора Нацыянальнага сімфанічнага аркестра. Заўтра будзе іншая справа, новы герой. Круціцца, бы тая вавёрка. Нават зараз, калі мы прыйшлі, не прысеў ніводнага разу: усё ходзіць, нешта паказвае. І так увесь час — без адпачынку, без прыпынку на доўгім шляху пад назвай жыццё.

## З дынастыі творцаў

У далёкім 1924 годзе ў мястэчку Мазоўша, што каля Варшавы, у сям'і мастака-літографа і настаўніцы музыкі нарадзіўся хлопчык. На свет з'явіўся творца. Толькі пра гэта яшчэ ніхто не падазраваў, хоць меліся ўсе падставы: дзед быў мастаком, тата — майстрам плаката.

Спадчыннасць зрабіла сваю справу. Творчыя здольнасці ў дзіцяці пачалі праяўляцца ўжо ў Варшаве, куды сям'я Заспіцкіх вымушана была пераехаць. Аднойчы бацька прынёс дахаты кнігу пра Мікеланджала і скрыню з пластылінам. Чытаць малы Андрэйка не вельмі любіў, а вось ляпіць пачаў адразу. Маці, дзядулю, сяброў... Сына запісалі на курсы лепкі і малявання. Там хлопчыку выдалі пасведчанне, дзякуючы якому ён мог бясплатна наведваць усе музеі Варшавы. З таго часу дома Андрэя амаль не бачылі: ён закахаўся... у мастацтва.

## Першая вайна і другая... радзіма

У Мінск Андрэй Заспіцкі прыехаў яшчэ да вайны. У 1939 годзе пачалося наступленне немцаў на Польшчу. Дабраліся і да Варшавы.

— Здавалася, што жыццё скончылася, — успамінае Андрэй Міхайлавіч. — Ноччу ляталі самалёты, удзень не сціхала страляніна.

На дом, дзе жыла сям'я Заспіцкіх, упала бомба. На шчасце, людзей толькі прысыпала. Пры дапамозе сяброў разам з іншымі жыхарамі пакінулі горад. Гэта была яго першая вайна...

У Мінску бацька ўладкаваўся ў Дом друку. Стаў каштоўным спецыялістам: дагэтуль у каляровай літаграфіі тут яшчэ ніхто не працаваў. Пятнаццацігадовага Андрэя аддалі на выхаванне ў Дом народнай творчасці. Таленавітага хлопчыка хутка заўважылі — і ён трапіў у Маскву, на выставу першай дэкады беларускага мастацтва і літаратуры. Тут — і першыя ўзнагароды! За бюст Дзяржынскага яму ўручылі Грамату Вярхоўнага Савета БССР.



У сваёй майстэрні, якую называе другім домам.



Першапачаткова сваіх герояў Андрэй Заспіцкі лепіць з пластыліну. Такі метад працы скульптар пераняў у свайго настаўніка — Аляксея Глебава.

Пасля такога поспеху Дом народнай творчасці накіраваў Андрэя Заспіцкага ў школу юных талентаў пры Акадэміі мастацтваў, што ў Ленінградзе. Разам з прадстаўнікамі ўсіх рэспублік былога СССР за год юнак засвойвае творчую навуку і паспяхова здае іспыты. Затым з лёгкасцю паступае ў акадэмію. Толькі вучыцца там Андрэю не давядзецца: неўзабаве пачнецца Вялікая Айчынная вайна. Юнак пакуль пра гэта не ведае, купляе білет на цягнік і адпраўляецца дахаты на канікулы.

## Другая вайна і сустрэча з домам

Як толькі Андрэй Заспіцкі прыехаў у Мінск, пачалася вайна. Далейшы лёс маладога скульптара быў вырашаны. Для адпраўкі на фронт абодва Заспіцкія не падыходзілі па ўзросце: адзін быў ужо дужа дарослы, другі — замалады. Разам з іншымі эвакуяваліся ў Сталінградскую вобласць. Як і многіх, іх адвезлі ў калгас, размеркавалі па хатах. Трэба было зарабляць на хлеб, і Андрэй пайшоў працаваць на кузню малатабойцам.

Калі юнаку споўнілася 18 гадоў, яго прызвалі ў армію. Усю вайну адстраляў на гармаце-саракапятцы. Неаднойчы трапляў у цэль. Яму шанцавала: міма яго кулі праляталі. «Бо я малы ростам», — жартуе Андрэй Міхайлавіч. Пасля вызвалення Беларусі дапамагаў «СМЕРШу» праводзіць так званую зачыстку: знішчаць нямецкія банды, якія засталіся ў лясах і мястэчках.

Пасля вайны маляваў у часці агітплакаты, ляпіў партрэты Леніна, Сталіна, Жукава. Спрабаваў паступаць у Студыю ваенных мастакоў імя Грэкава. Толькі, як той казаў, апынуўся не ў той час не ў тым месцы: якраз у гэтыя дні кіраўніцтва студыі было ў Берліне — удзельнічала ў Нюрнбергскім працэсе.

Дэмабілізаваўся Андрэй Заспіцкі ў 1947 годзе. Адоранага байца адпускаць не хацелі, але прыйшлося... Вельмі хацелася яму ўбачыць бацькоў, якія пасля эвакуацыі вярнуліся ў Гродна.

«Пяць гадоў не ведаў, дзе яны, што з імі, — успамінае скульптар. — Якое ж было шчасце ўбачыць іх жывымі! Я іх не пазнаў: за вайну яны вельмі змяніліся, моцна пастарэлі. А яны не пазналі мяне: сказалі, што іх сын стаў дарослым».

## Знаёмства з Быкавым

Не паспеўшы атрымаць асалоду ад мірнага і вольнага жыцця, Андрэй Заспіцкі пайшоў шукаць працу. Яму прапанавалі маляваць шыльды пад кіраўніцтвам галоўнага гродзенскага мастака. Вядома, гэта была не тая справа, на якую разлічваў апантаны мастацтвам юнак, але не да выбару тут — грошы былі патрэбны. Першым часам яму дапамагаў бацька, пасля спраўляўся сам. Так на гарадскіх будынках пачалі з'яўляцца яго шыльды.

«Але што ні робіцца, дык толькі да лепшага, — пераканаўны майстар. — Ці адбылося б пры іншых абставінах маё знаёмства з чалавекам, з якім я пасябраваў на ўсё жыццё?»

Гэта ён гаворыць пра Васіля Быкава. Толькі тады, калі яны пазнаёміліся, гэтае імя яшчэ ні пра што не казала. А адбылося гэта ў звычайнай кавярні, куды Заспіцкі прынёс ужо зробленую шыльду з надпісам «Піва-воды». Грашыма тады асабліва не плацілі, за работу з мастаком разлічыліся ліманадам. Вось і сеў ён за столік, каб наталіць смагу. Насупраць сядзеў Быкаў. Разгаварыліся. Аказалася, што іх шмат што звязвае: да вайны вучыліся жывапісу, ваявалі на франтах Вялікай Айчыннай.

— Я прапанаваў Васілю разам са мной маляваць шыльды, ён пагадзіўся, — расказвае Андрэй Міхайлавіч. — Вось і хадзілі мы з гэтымі таблічкамі па горадзе. Мы з ім вельмі пасябравалі. Я тады і падумаць не мог, што неўзабаве ён не карціны, а аповесці пачне пісаць.

Менавіта Васіль Быкаў пазней і паклікаў яго ў Мінск. Сказаў, куды трэба ісці. Гэта была майстэрня Аляксея Глебава.

## Бацька-Глебаў, візіт Машэрава і плач маці-патрыёткі

Так і зрабіў. Калі прыехаў у Мінск, адразу пайшоў на вуліцу Някрасава — тут былі майстэрні Глебава, Азгура, Бембеля, яшчэ маладога Селіханава.

— Зайшоў да Аляксея Канстанцінавіча ў салдацкім шынялі, у ботах, — згадвае скульптар. — Ён, амаль нічога не пытаючыся, даў мне пластылін і сказаў што-небудзь вылепіць. Ляпіў два дні. На трэці ён мне і кажа: «Заставайся. Будзеш у мяне працаваць».

І ён застаўся. Глядзеў, як трэба ляпіць. У іх пачалі з'яўляцца сумесныя працы. Глебаў быў для яго больш, чым настаўнік: Заспіцкі называў яго бацькам.

З лёгкай глебаўскай рукі пачалася ў Заспіцкага праца па будаўніцтве Мінска. Ствараў помнікі, бюсты, барэльефы, мемарыяльныя дошкі... Над буйнымі праектамі працаваў у тандэме з іншымі скульптарамі. За помнік Купалу яго разам з Анікейчыкам і Гумілеўскім узнагародзілі Дзяржаўнай прэміяй БССР. А за манумент у гонар маці-патрыёткі ў Жодзіне скульптары Заспіцкі, Міско, Рыжанкоў і архітэктар Трафімчук сталі лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі СССР.

Андрэй Міхайлавіч яшчэ памятае, як гэты комплекс у мініяцюры памяшчаўся ў яго майстэрні. Помніць і тое, як сюды прыязджаў сам Машэраў, каб ацаніць будучы мемарыял. Лёс гэтай жанчыны, у якой на вайне загінула пяцёра сыноў, яго вельмі ўсхваляваў. Таму ўвекавечыць гэтую трагедыю было для яго задачай № 1.

— Помнік павінен быў прымаць Камітэт савецкіх жанчын на чале з Валянцінай Церашковай.



Сям'я заўсёды была крэпасцю майстра. З жонкай Нінай Сцяпанаўнай і дачкой Наталляй.

Ён жа прыехаў раней, — гаворыць Андрэй Заспіцкі пра першага сакратара ЦК КПБ. — Мы з Пятром Міронавічам падбіралі тэкст, які пасля напісалі на мемарыяле. Ён прыйшоў адзін, вартавыя засталіся за дзвярыма. Вельмі добры чалавек быў, сумленны.

Перад тым, як брацца за такую адказную справу, скульптары ездзілі да Настассі Купрыянавай у Жодзіне. Яна тады ўжо была бабулькай, але добра зразумела, што ад яе хочуць. Дапамагла, чым змагла: знайшла партрэты ўсіх сыноў, шмат пра іх расказвала.

— Калі ўсталявалі помнік, прывезлі туды Купрыянаву, — расказвае творца. — Яна моцна плакала. І яе слёзы былі для нас самай вялікай ацэнкай. Мы зразумелі, што ўсё зрабілі правільна. І галоўнае, праўдзіва. Яна настолькі мяне ўразіла, што я пасля вылепіў яе бюст, які цяпер знаходзіцца ў адным з беларускіх музеяў.

> **«Вось і хадзілі мы з гэтымі таблічкамі па горадзе. Мы з Васілём Быкавым вельмі пасябравалі. Я тады і падумаць не мог, што неўзабаве ён не карціны, а аповесці пачне пісаць».**

## Парада Цанаву

Аднойчы Заспіцкаму разам з іншымі скульптарамі даручылі аформіць будынак, дзе цяпер знаходзіцца КДБ. Гэта быў праект яго сябра — Паўла Белавусава. Ён жа яму дапамагаў.

Калі Белавусава да сябе ў кабінет паклікаў Лаўрэнцій Цанава, Заспіцкі пайшоў з ім. Старшыню НКУС турбавала, якім колерам пафарбаваць сцены. І Андрэй выручыў свайго сябра, сказаўшы, што лепш яны будуць глядзецца ў колеры лёгкай зеляніны. «Паглядзім», — пачулі яны ў адказ. Пагаварылі некалькі хвілін і пайшлі.

— Толькі зачынілі дзверы, як кажу Пашу: «Калі яму не спадабаецца, нам не паздаровіцца». На шчасце, таму спадабалася.

Усё жыццё Андрэй Заспіцкі трымаўся як мага далей ад палітыкі і ўлады. Праўда, быў адзін выпадак, калі ён трапіў пад падазрэнне. Калі аднойчы скульптар ствараў кампазіцыю пра вайну, да яго ў майстэрню прыехалі з КДБ — быццам паглядзець, як ён працуе. Як потым зразумеў скульптар, правяралі, ці не пакінуў ён у сваім творы пэўны фашысцкі знак. На гэтым усе непаразуменні ў майстра з уладай і скончыліся.

## Душэўная маладосць

Андрэй Заспіцкі ніколі не любіў публічнасці. Ён ціха рабіў сваю справу. Ствараў для народа, для Беларусі. Яго барэльеф «Гусляр» упрыгожвае Нацыянальную бібліятэку, барэльеф «Крэпасць» — святыню стойкасці беларусаў у Брэсце. Яшчэ шмат іншых прац аўтара сведчаць пра тое, што невыпадкова ён носіць ордэн Францыска Скарыны, з'яўляецца ганаровым грамадзянінам Мінска.

Яго асабістай крэпасцю заўсёды была сям'я. З жонкай Нінай Сцяпанаўнай пражылі 60 гадоў! Выхавалі дачку, дзвюх унучак. Ужо адзін дачакаўся праўнука. На магіле жонкі стаіць барэльеф, які стварыў сам майстар. Яна на ім прыгожая і маладая — такая, якой запомнілася яму.

Андрэй Заспіцкі прызнаецца, што неаднойчы ляпіў сябе. І так атрымлівалася, што заўсёды маладога. «Мне хочацца сябе такім бачыць, а ў люстэрку я ўжо зусім іншы», — смуткуе творца. Затое ў душы ён, як некалі — вясёлы, жвавы, аптымістычны. І каб хоць не страціць гэтую маладосць, Андрэй Міхайлавіч трымае сябе ў форме. Кожную раніцу робіць па 50 прысяданняў, займаецца з гірамі. Быццам пацвярджаючы свае словы, ён вядзе нас у свой «міні-спартзал» — у куточак майстэрні. Бярэ гіры і, махаючы рукамі, тлумачыць: «Калі ў руках не будзе сілы, ляпіць будзе цяжка. А без лепкі я не ўяўляю свайго жыцця».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ**

■ Працяг тэмы

# Адкуль прыплылі журавіны?



**31 кастрычніка ў нашай газеце быў змешчаны здымак, які адлюстроўвае збор ураджаю журавін у адкрытым акцыянерным таварыстве «Палескія журавіны» Пінскага раёна. У рэдакцыю патэлефанаваў чытач і папрасіў патлумачыць, што азначае гэтае «возера ягад». «Ці іх вырошчваюць у вадзе, ці яны сюды прыплылі?» — цікавіўся ён. Сапраўды, чалавеку недасведчанаму нялёгка зразумець тэхналогію збору журавін па адным фотаздымку.**

— Па тлумачэнне мы звярнуліся да **дырэктара «Палескіх журавін» Васіля ЛЯГУСКАГА.**

Васіль Рыгоравіч расказаў карэспандэнту «Звязды», што гаспадарка вырошчвае журавіны на плошчы крыху больш за 80 гектараў. Ягадныя плантацыі размешчаны ў полі ля вёскі Селішча. Тут нават не балоцістая мясцовасць, пасля правядзення меліярацыі зямля ўяўляе сабой звычайныя сельгасугоддзі. Журавіны растуць участкамі, адгароджанымі невялікімі землянымі насыпамі. Гэтыя ўчасткі-грады называюць чэкамі. Працаўнікі гаспадаркі клапоцяцца пра ягады круглы год, расліны падкормліваюць, абараняюць ад пустазелля. Па чэках ходзяць тэхніка і людзі. Адзіная асаблівасць журавінавых палетках заключаецца ў тым, што яны акружаны па перыметры каналамі. І вось калі прыходзіць пара збіраць ураджай, узровень вады рэгулююць шлюзамі. Вада паступова паднімаецца і залівае плантацыі. Гэта робіцца толькі для таго, каб зрабіць магчымым механізаваны збор ягад. У поле выходзяць трактары. Спецыяльным механізмам, які аддалена нагадвае лопасці млына, яны боўтаюць ваду, узбагачаюць яе паветрам. Пасля гэтага ягады ўсплываюць на паверхню. Тады агрэгатам, падобным на рыбалоўную сетку, журавіны паступова захопліваюць і ўручную цягнуць да берага. Работа гэта вельмі нялёгкая. Тыя, хто ідуць па вадзе і цягнуць груз, нагадваюць бурлакоў на Волзе. Але ручная работа на гэтым заканчваецца. Далей ягады збірае і загружае ў транспарцёр для сартавання спецыяльная тэхніка. Сабраныя журавіны ў асноўным ідуць на вытворчасць джэмаў, морсаў, іншых прадуктаў перапрацоўкі.





А вось журавіны, якія купляюць гандлёвыя партнёры з Англіі, Польшчы, Германіі, Нідэрландаў, Расіі, іншых краін, збіраюцца ўручную. На экспарт можна пастаўляць толькі цэлыя, прыгожыя адборныя ягады. Таму на сезон нарыхтоўкі прадпрыемства наймае зборшчыкаў, найбольш з ліку мясцовых жыхароў. Зборшчык павінен не толькі беражліва зняць ягады з расліны, але і перабраць іх. Паводле слоў Васіля Лягускага, некаторыя сем'і за дзень зарабляюць да мільёна рублёў на зборы.

Сёлета гаспадарка атрымала каля 500 тон журавін, з іх прыкладна палова будзе адгружана ў далёкае і блізкае замежжа. З'яўяцца ягады і на паліцах брэсцкіх, мінскіх крам, калі гандлёвыя арганізацыі захочуць працаваць з айчыннай вітаміннай прадукцыяй. Як заўважылі ў гаспадарцы, нярэдка сталічныя супермаркеты зімой прапаноўваюць пакупніку імпартныя ягады, нашмат даражэйшыя за палескія, а свае бяруць на рэалізацыю неахвотна.

Клопаты пра журавіны ў палескіх земляробаў з надыходам халадоў не заканчваюцца. Як толькі ўборка завяршылася, вада сышла, палі набываюць свой ранейшы выгляд. Чэкі ачышчаюць, прыводзяць у парадак. І зноў патроху пачынаюць запаўняць вадой. Калі пачнуцца маразы, усё пакрыецца лёдам. Ягады лепш пераносяць зіму ў лядовым «футры», такая іх асаблівасць. Вясной лёд растане, ваду спусцяць, і журавіны зацвітуць, каб прынесці новы ўраджай.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ**

# СТРАСЦІ ПА БАЛКОНЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ летам маці патэлефанавала ў дыспетчарскую віцебскага жыллёва-эксплуатацыйнага ўчастка №7 (далей ЖЭУ-7. — **Аўт**.); хацела даведацца, што трэба зрабіць, каб заказаць паслугу па фарбаванні рам балкона і двух вокнаў у нашай маленькай кватэры-«хрушчоўцы». На тым канцы провада параілі прыйсці ў ЖЭУ і звярнуцца да супрацоўніка, які курыруе платныя паслугі.

Майстар па бягучым рамонце даў запоўніць адмысловы бланк. Адразу адзначыў, што шмат працы, таму хутка заяўка выканана не будзе... Чакалі больш за месяц. Але рабочыя так і не прыйшлі, як і сам майстар, які паабяцаў, што ўсё агледзіць, замерыць і вызначыць кошт паслугі.

Напісаў я скаргу ў аблвыканкам — на імя намесніка старшыні. Прыйшла «камісія»: прадстаўнікі ЖЭУ, жыллёва-рамонтнага эксплуатацыйнага трэста і рамонтна-будаўнічага ўпраўлення таго ж трэста.

Як мяне запэўнівала работніца трэста, маці або мне трэба было зарэгістраваць заяву на аказанне паслугі. Але ж дыспетчар сказала звярнуцца да майстра, які пра гэта нічога не паведаміў. Пачуў і пра тое, што дамоў шмат, а работнікаў, каб іх абслугоўваць, не хапае. Пра тое, што план па аказанні платных паслуг выкананы, але, зразумела, усіх не задаволіш.

«Камісія», аглядаючы стан балконнай рамы, заўважыла, што ніжні брус яе і «каробкі» гніе. Вырашылі, што брус трэба замяніць, а работы па афарбоўцы правесці вясной наступнага года, калі надвор'е будзе спрыяць.

Паколькі намі быў зроблены заказ і на фарбаванне вокнаў на кухні і ў спальні, агледзелі і іх. Прызналі, што акно на кухні знаходзіцца ў дрэнным стане. Але рамонт, нават дробны, не паабяцалі і перад наступленнем халадоў. У выніку праз шчыліны паміж шклом і рамай на кухні дзьме і цяпер. Заклейваў два разы, дарма час патраціў. Дарэчы, дзіўная сітуацыя: цагляны дом уцяплілі «футрам», а вокны не замянілі.

Два хлопцы праз пару дзён знялі балконную раму, адну з частак забралі, каб замяніць ніжні брус. У вызначаны дзень яе не прывезлі і нават не патэлефанавалі... Дажджы залівалі балкон і перыметр, дзе стаяла рама. Урэшце раму занеслі ў кватэру рабочыя ЖЭУ. Пачалі ў дождж устанаўліваць яе на ніжні брус. Ды не залазіць. Выклікалі выканаўцу абавязкаў начальніка ўпраўлення, які прыходзіў раней у складзе «камісіі». Той даў каманду ставіць. Падчас сваёй напружанай працы рабочыя ўвесь час ужывалі нецэнзурныя словы, але... рама ўсё роўна не ўстаўлялася. Паабяцалі, што прыйдуць пасля абедзеннага перапынку. Прыйшлі яшчэ з адным калегам. Скардзіліся на вялікую загрузку і нізкі заробак, на тое, што нейкія дошкі ў іх на вуліцы ляжаць, а ім загадалі маім балконам займацца. Нарэшце скончылі працу і сказалі, што ўсё добра.

## «Белы не горшы, чым карычневы»

Паглядзеў я на тую раму і падумаў, што мне ўсё гэта сніцца. Суседняя частка рамы не стыкуецца з той, якую замянілі, а таму не зачыняецца. Чамусьці пафарбавалі раму з двух бакоў у белы колер, а раней жа звонку яна была карычневай. Тэлефаную ў ЖРЭТ. Зноў прыйшла «камісія». Наконт колеру пачуў, што «белы не горшы, чым карычневы». Маўляў, ну што вам не спадабалася? Дык самі ж камунальнікі могуць аштрафаваць, калі без узгаднення з імі памяняеш вокны, бо колер усіх вокнаў у доме павінен быць аднолькавым. «Так!» — адказалі мне. Маўляў, у цёплы час года перафарбуем. А частку рамы з дэфектам вырашылі зноў забраць у рамонт... Праўда, на гэты раз прадстаўнік упраўлення нешта замяраў. Праз некалькі дзён раму ўставілі. І ніжні брус балкона, які таксама гніў, замянілі. Новыя рабочыя не лаяліся і працавалі добра. Я даў ім фарбу, і яны пафарбавалі раму ў неабходны колер.

З першага візіту «камісіі» да завяршэння ўсіх работ на балконе прайшло больш за два тыдні. А з афармлення заказу на фарбаванне — прыкладна два месяцы. Як жа пакаралі вінаватых?

«Майстар па бягучым рамонце ЖЭУ-7 папярэджаны аб недапушчальнасці фактаў, указаных у Вашым звароце, пазбаўлены надбаўкі за складанасць і напружанасць працы і прэміі за верасень-кастрычнік у памеры 12%. Начальніку ЖЭУ-7 указана на неабходнасць узмацнення кантролю за працай участка бягучага рамонту. Прыносім свае прабачэнні за нязручнасці...», — гаворыцца ў лісце, падпісаным начальнікам упраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскага аблвыканкама.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Парады чытачам

**Каб не трапіць у сітуацыю, калі вам давядзецца даказваць, што вы не вярблюд, раю наступнае:**

❍ неабходна патрабаваць, каб рэгістраваліся ўсе вашы звароты ў ЖЭУ;

❍ лепш за ўсё, калі вы звяртаецеся не па тэлефоне, папрасіце нейкую «распіску» аб тым, што заказ прыняты;

❍ варта браць сведку пры афармленні заяўкі, каб, калі што, пацвердзіў, што вы маеце рацыю;

❍ вельмі эфектыўна скардзіцца на дрэнную працу камунальнікаў або яшчэ кагосьці, у чыёй дапамозе маеце патрэбу, па «прамых лініях», якія праводзяць адказныя асобы;

❍ калі вам адмовілі ў запісе на асабісты прыём да адказнай асобы, патрабуйце пісьмовай адмовы;

❍ можна звярнуцца да «прыватнікаў», гэта будзе каштаваць даражэй, але ёсць надзея, што зробяць усё своечасова і якасна.

БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «АСБ Беларусбанк»**
**с 4 декабря 2013 года установил процентные ставки по вновь принимаемым банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:**

**– «Гарантированный доход» (срок хранения 35 дней)** — 43% годовых *(по ранее принятым вкладам установленный размер процентной ставки применяется с даты автоматического перезаключения на новый срок, начиная 04.12.2013);*

**– «Приоритет» (срок хранения 3 месяца)** — 45% годовых;

**– «Интернет-депозит» —** 45% годовых *(по ранее принятым вкладам, по которым не нарушена срочность, установленный размер основного дохода применяется с 04.12.2013);*

**– «Новогодний»:**

- за 1-й месяц хранения вклада *(считая со дня открытия вкладного счета)* – 44% годовых;
- за 2-й месяц хранения вклада *(считая со дня открытия вкладного счета)* – 45% годовых;
- за 3-й месяц хранения вклада *(считая со дня открытия вкладного счета)* – 46% годовых.

По вновь оформляемым сберегательным сертификатам со сроком обращения 2 месяца процентная ставка установлена в размере 45% годовых.

С 04.12.2013 по 01.02.2014 (включительно) возобновлен прием денежных средств на срочный банковский вклад (депозит) в белорусских рублях **«Интернет-депозит-Презент»** с процентной ставкой — 44% годовых.

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка».**

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.
**Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов).**



## ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ,

***опубликованной 29 октября 2013 года в газете «ЗВЯЗДА»***
**по объекту «Группа многоквартирных жилых домов по генплану №№ 11, 12, 13 в микрорайоне № 1 реконструируемой застройки в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая дер. Сухарево)»**

**ООО «АРТЕС-СТРОЙИНВЕСТ» информирует** о **дополнении** к проектной декларации объекта долевого строительства, опубликованной в газете «ЗВЯЗДА» № 204 от 29 октября 2013 года:

***Для заключения договоров долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, дополнительно предоставляются*** *в* жилом доме № 13 по генплану следующие квартиры:

- 1 (одна) однокомнатная квартира в дополнение к пункту а) проектной декларации по ранее опубликованным условиям и ценам;
- 2 (две) двухкомнатные квартиры в дополнение к пункту б) проектной декларации по ранее опубликованным условиям и ценам;
- 2 (две) двухкомнатные квартиры со строительными номерами № 2 и № 170 в дополнение к пункту д) проектной декларации по ранее опубликованным условиям и ценам.

**Информацию об объекте долевого строительства**, планировках квартир и условиях заключения договоров можно получить у Застройщика по телефону 8 (017) 3060611 или в риэлтерской организации ООО «ДИНАС» (сайт **www.dinas.by**, тел. **8 (017) 2339610**).

УНП 191024785


**В суд Кобринского района** поступило заявление с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о гражданине МОРОЗЕ Владимире Александровиче, 5 августа 1979 года рождения, последнее место жительства: г. Кобрин, ул. Дружбы, д. 17, кв. 36, Брестской области, ушедшего из дома в 2010 году, с предложением в течение двух месяцев с момента публикации сообщить суду Кобринского района Брестской области соответствующие сведения о данном гражданине.

■ Май на ўвазе

# КАНДУКТАРЫ СТАНУЦЬ РЭВІЗОРАМІ...

## ...ПАСЛЯ ЎВОДУ ЭЛЕКТРОННАГА ПРАЯЗНОГА

**Пра гэта стала вядома падчас анлайн-канферэнцыі «Транспартнае забеспячэнне горада Мінска» на сайце БЕЛТА. Удзел у ёй прымалі дырэктар ДУ «Сталічны транспарт і сувязь» Валерый Шкуратаў і намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства «Мінсктранс» Віктар Тозік. «Звязда» публікуе найбольш цікавыя адказы спецыялістаў.**

### З'явіцца аўтобус «Мінск — Беласток»

«Пастаянным попытам у пасажыраў карыстаюцца міжнародныя аўтобусныя маршруты ў Маскву, Санкт-Пецярбург, Вільнюс, а таксама рэйсы, якія праходзяць праз гэтыя гарады,— заявіў Віктар Тозік.— Яны прыносяць найбольшую долю даходаў прадпрыемства «Мінсктранс». У 2014 годзе плануецца адкрыць дадатковыя маршруты на Маскву, Санкт-Пецярбург, а таксама новыя міжнародныя маршруты: «Мінск — Роўна», «Мінск — Барысполь (аэрапорт)», «Мінск — Беласток».

### Колькі праехаў — за столькі і плаці

Прадстаўнік Мінсктранса паведаміў, што ўвод у прамысловую эксплуатацыю аўтаматызаванай сістэмы аплаты і кантролю праезду (АСАКП) у пасажырскім транспарце Мінска плануецца ў другім паўгоддзі 2014 года. Першапачаткова мяркуецца прытрымлівацца дзейнай тарыфнай палітыкі, дапоўніўшы пералік білетнай прадукцыі праязнымі квіткамі на любую колькасць дзён і пэўны лік паездак. «Пасля апрацоўкі і аналізу статыстычнай інфармацыі, атрыманай праз першы час працы АСАКП, запланавана ўкараніць дыферэнцаваны падыход да аплаты праезду за фактычна аказаную транспартную паслугу»,— сказаў Віктар Тозік. Дарэчы, па яго словах, пасля таго, як пачне дзейнічаць электронны праязны, кандуктары будуць пераведзены ў штат рэвізораў. Варта таксама адзначыць, што ўкараненне АСАКП прадугледжвае выкарыстанне адзінай карткі, якая падтрымліваецца як у наземным транспарце, так і ў метрапалітэне.

### Сабекошт паездкі — Br6400

«Змяненне тарыфаў на гарадскія перавозкі пасажыраў у 2014 годзе будзе адбывацца з улікам рэальнага росту даходаў насельніцтва і з улікам параметраў, прадугледжаных законам аб бюджэце на чарговы фінансавы год. Сёння сабекошт адной паездкі ў гарадскім пасажырскім транспарце складае 6400 рублёў. Змяненне сабекошту ў 2014 годзе залежыць ад росту коштаў і тарыфаў на складнікі артыкулаў выдаткаў»,— патлумачыў Віктар Тозік.

### Аплата праз SMS-паведамленні

«Да канца студзеня плануецца абсталяваць па адным турнікеце для аплаты праезду праз SMS-паведамленні ў кожным вестыбюлі станцый метро. Затым будзе праводзіцца тэставая эксплуатацыя, па выніках якой новая сістэма будзе ўведзена ў прамысловую эксплуатацыю»,— сказаў прадстаўнік Мінсктранса.

### Да чэмпіянату — новыя маршруты

Для паляпшэння транспартнага абслугоўвання падчас чэмпіянату свету па хакеі, па словах Віктара Тозіка, распрацавана 11 новых аўтобусных маршрутаў: 1) ст. м. Аўтазаводская — «Чыжоўка-Арэна», 2) Студэнцкая вёска — «Чыжоўка-Арэна», 3) Пр. Лошыца— «Чыжоўка-Арэна», 4) АВ Цэнтральны — «Мінск-Арэна», 5) ст. м. Няміга — «Мінск-Арэна», 6) Студэнцкая вёска — «Мінск-Арэна», 7) АВ Цэнтральны — Студэнцкая вёска, 8) АВ Цэнтральны — Нацыянальны аэрапорт Мінск, 9) Нацыянальны аэрапорт Мінск — Студэнцкая вёска, 10) «Чыжоўка-Арэна» — «Мінск-Арэна» (2 варыянты). Распрацаваны таксама два новыя тралейбусныя маршруты — ст. м. Аўтазаводская — «Чыжоўка-Арэна» і ст. м. Пушкінская — «Мінск-Арэна».

### Для гасцей чэмпіянату — асаблівы праязны

Віктар Тозік заявіў, што «на час чэмпіянату свету па хакеі распрацоўваецца спецыяльны праязны білет для гасцей і ўдзельнікаў ЧС-2014, які будзе дзейнічаць на ўсіх відах грамадскага транспарту горада Мінска, а таксама на гарадской электрычцы. Спецыяльны праязны білет будзе ўключаны ў турыстычныя пакеты на чэмпіянат свету па хакеі».

### «Малінаўка» — не раней за май

Прадстаўнік Мінсктранса пацвердзіў ранейшую інфармацыю аб тым, што ўвод у пастаянную эксплуатацыю станцыі метро «Малінаўка», з улікам яе будаўнічай гатоўнасці, магчымы не раней за май 2014 года. Сказаў ён некалькі слоў і пра будучыя станцыі трэцяй лініі метро: «Праектным рашэннем для станцый першага ўчастка трэцяй лініі метрапалітэна («Кавальская Слабада», «Вакзальная», «Плошча Ф. Багушэвіча», «Юбілейная плошча») з мэтай выключэння падзення пасажыраў на пуці прадугледжана агароджа платформенных участкаў. Аднак абсталяваць такімі агароджамі станцыі, якія ўжо эксплуатуюцца, з-за канструкцыйных асаблівасцяў не ўяўляецца магчымым. Акрамя таго, сёння на разглядзе ў парламенце знаходзіцца праект закона аб гарадскім электрычным транспарце і метрапалітэне. Пасля яго прыняцця Міністэрства транспарту і камунікацый распрацуе правілы перавозак пасажыраў. Для прадухілення выпадкаў падзення на эскалатары спецыялісты Мінскага метрапалітэна ўнеслі прапанову пра ўключэнне ў правілы пункта аб забароне хаджэння па эскалатары».



### Таксісты павінны выглядаць прыстойна

Валерый Шкуратаў, адказваючы на пытанне пра дзейнасць таксі ў сталіцы, звярнуў увагу на некаторыя аспекты, якія дапамогуць павысіць якасць абслугоўвання на гэтым відзе транспарту: «Неабходна ўвесці патрабаванні да стану транспартных сродкаў. Сярод іх — абмежаванне па тэрмінах эксплуатацыі аўтамабіля таксі. Раней такая норма дзейнічала — дазвалялася выкарыстоўваць транспартны сродак на працягу 10 гадоў. На мой погляд, гэтае патрабаванне варта вярнуць. Яшчэ адна актуальная праблема — знешні выгляд таксістаў, якія часам дазваляюць сабе прыязджаць да кліента ў спартыўнай форме. Я перакананы, што калі чалавек працуе ў такой высокааплатнай сферы, як таксі, выглядаць ён павінен адпаведным чынам. Таму, на мой погляд, неабходна сфарміраваць на заканадаўчым узроўні патрабаванні да знешняга выгляду таксістаў».

**Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ** ■

## ПАЛІВА КРЫХУ ПАДАРАЖЭЛА

**З 5 снежня ў краіне павялічыліся цэны на бензін і дызельнае паліва.**

Канцэрн «Белнафтахім» абнародаваў новыя адпускныя і рознічныя цэны на нафтапрадукты, што рэалізуюцца праз АЗС. У сярэднім рознічныя цэны па паліва павялічыліся на 2 працэнты. Так, цяпер адзін літр бензіну АІ-92 каштуе 8,6 тысячы рублёў, бензін АІ-95 – 9,3 тысячы рублёў, адзін літр дызельнага паліва — 9,4 тысячы рублёў.

Перагляд цэн праведзены ў сувязі са змяненнем курса беларускага рубля ў дачыненні да замежных валют.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Справы гаспадарчыя

# БЕЗ УВАГІ НЕ ЗАСТАЕЦЦА НІХТО

**Больш за 900 відаў бытавых паслуг прадастаўляюць грамадзянам суб'екты гаспадарання сферы бытавога абслугоўвання насельніцтва. Пра гэта паведаміла начальнік упраўлення Мінгандлю Валянціна ЛЯЎКОЎСКАЯ.**

За дзевяць месяцаў сёлета ў краіне адкрыта 707 новых аб'ектаў бытавога абслугоўвання, з іх больш за палову — у Мінску. Аднак і ў рэгіёнах, па словах Валянціны Ляўкоўскай, нормы па забеспячэнні жыхароў бытавымі паслугамі таксама выконваюцца. Цэнтры абслугоўвання ёсць ва ўсіх раёнах. Неабходны мінімум у іх складаецца з 11 базавых паслуг — цырульня, рамонт адзення, абутку, бытавой тэхнікі… Апроч таго, сельскім жыхарам арганізацыі аказваюць дапамогу па стварэнні і ўсталяванні жалезабетонных вырабаў, пілаванні і нарыхтоўцы дроваў, памоле зерня і іншыя. Безумоўна, стацыянарныя аб'екты абслугоўвання ёсць далёка не ў кожным населеным пункце. Да таго ж у сувязі са скарачэннем сельскага насельніцтва адбываецца іх аптымізацыя. Але кожная рэгіянальная базавая арганізацыя мае ад 10 да 20 комплексных прыёмных пунктаў, за якімі замацаваны зоны абслугоўвання. «Без увагі не застаецца ні адна маленькая вёска, нават аддалены хутар»,— адзначыла Валянціна Ляўкоўская.



Арганізацыі бытавога абслугоўвання насельніцтва ўдасканальваюцца ў існых формах прадастаўлення паслуг і ўводзяць новыя. Усё большай папулярнасцю карыстаюцца паслугі па каталогах і сертыфікатах з прадастаўленнем зніжак і купонаў на комплекснае абслугоўванне. Развіваецца і выязное абслугоўванне грамадзян, пашыраецца спектр паслуг пры дапамозе інтэрнэту. У арганізацыях распаўсюджваюцца новыя тэхналогіі, з'яўляецца новае абсталяванне.

Усяго ў сферу бытавога абслугоўвання ўваходзіць каля 20 тысяч суб'ектаў гаспадарання, з іх 13 тысяч юрыдычных асоб і 7 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў. Пераважным у галіне з'яўляецца недзяржаўны сектар эканомікі: ён складае больш за 80%.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК** ■

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | - Капитальное строение, инв. № 400/С-38149 (назначение – здание административно-хозяйственное), (принадлежности: тепловая, канализационная (фекальная) сеть), г. Гродно, ул. Победы, 20, 2-этажное, кирпичное, 1987 г.п., S общ. – 251,3 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55780 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – Материальный склад), г. Гродно, ул. Победы, 20/2, 1964 г.п., кирпичный, S общ. – 2701,3 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-53918 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад № 3), (принадлежность: топочная; эстакада), г. Гродно, ул. Победы, 20/3, 1993 г.п., кирпичный, S общ. – 171,0 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55782 (назначение – здание нежилое, наименование – пилорама), г. Гродно, ул. Победы, 20/4, кирпичная, 1970 г.п., S общ. – 150,6 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-2900 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж для тракторов), г. Гродно, ул. Победы, 20/5, кирпичное, 1993 г.п., S общ. – 199,1 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55738 (назначение – здание нежилое, наименование – водонасосная), г. Гродно, ул. Победы, 20/6, кирпичная, 1982 г.п., S общ. – 45,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-49804 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж на 7 машин), г. Гродно, ул. Победы, 20/7, кирпичное, 1987 г.п., S общ. – 285,3 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-49807 (назначение – здание многофункциональное – весовая с гаражом), (составные части: гараж), г. Гродно, ул. Победы, 20/8, кирпичное, 1963 г.п., S общ. – 93,1 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-3112 (назначение – здание нежилое, наименование – сушильная камера-мастерская), г. Гродно, ул. Победы, 20/9, кирпичная, 1993 г.п., S общ. – 64,5 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-19819 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад для металла), г. Гродно, ул. Победы, 20/10, кирпичный, 1963 г.п., S общ. – 682,8 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-2864 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж на 6 автомашин), г. Гродно, ул. Победы, 20/11, кирпичный, 1987 г.п., S общ. – 150,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-3376 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж на три места), г. Гродно, ул. Победы, 20/12, кирпичный, 1993 г.п., S общ. – 182,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55741 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад горючих и масел с гаражом и заправочной), г. Гродно, ул. Победы, 20/13, кирпичный, 1963 г.п., S общ. – 67,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55743 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад химпродуктов), г. Гродно, ул. Победы, 20/14, кирпичный, 1990 г.п., S общ. – 47,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-50180 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж для легкового транспорта), г. Гродно, ул. Победы, 20/15, кирпичный, 1994 г.п., S общ. – 69,0 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55737 (назначение – здание нежилое, наименование – насосная станция для перекачки кислот и горючих материалов), г. Гродно, ул. Победы, 20/16, кирпичная, 1963 г.п., S общ. – 8,5 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55739 (назначение – здание нежилое, наименование – уборная на 2 очка), г. Гродно, ул. Победы, 20/17, кирпичная, 1963 г.п., S общ. – 6,4 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55740 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – пожарный резервуар на 300 $м^3$), г. Гродно, ул. Победы, 20, бетон, 1964 г.п., S общ. – 75 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-53259 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – проезд), (принадлежность две ц/б площадки), г. Гродно,, ул. Победы, 20, S общ. – 5957,0 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-53253 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), г. Гродно, ул. Победы, 20, чугун, сталь, 1979 г.п., протяж. 0,146 км.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-53262 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – ограждение территории), (принадлежности: ворота автомобильные металлические, ворота автомобильные механические металлические.<br>- Капитальное строение, инв. № 400/С-55781 (назначение – здание нежилое, наименование – проходная), (принадлежность – канализация фекальная), 1963 г.п., кирпичная, S общ. – 58,9 кв.м.<br>- Кабельная линия электропередач 0,4 кВт, г. Гродно, ул. Победы, 20.<br>- Воздушная линия электропередач 0,4 кВт, г. Гродно, ул. Победы, 20. |

| | |
|---|---|
| **Местонахождение объекта** | г. Гродно, ул. Победы, 20 |
| **Лот расположен на земельном участке** | Кадастровый номер 440100000001001667, площадью 1,6481 га (назначение – земельный участок для содержания и обслуживания производственной базы) |
| **Начальная цена продажи** | 7 607 353 792 (семь миллиардов шестьсот семь миллионов триста пятьдесят три тысячи семьсот девяносто два) белорусских рубля без учета НДС |
| **Сумма задатка** | 380 367 690 (триста восемьдесят миллионов триста шестьдесят семь тысяч шестьсот девяносто) белорусских рублей |
| **Продавец** | Ликвидационная комиссия РУПП «Гроднотекстиль», 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121 тел./факс 43-99-64 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 23 декабря 2013 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Извещение о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» № 178 (27543) от 21.09.2013 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 17 декабря 2013 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**

## ЧПТУП «Пчелаут и М»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ЧПТУП «Пчелаут и М» со снижением цены на 50%

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена лота, без НДС, руб. | Задаток в размере 5%, без НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | **Здание детского сада с инв. № 310/С-22236 общей площадью 1059,0 кв.м, расположенного по адресу: Гомельская область, Гомельский р-н, Долголесский с/с, д. Долголесье, ул. Центральная, 58а, расположенное на земельном участке площадью 0,6486 га** | 344853000 | 17242650 |

Организатор торгов: **управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

Продавец: **ЧПТУП «Пчелаут и М», 246050, г. Гомель, ул. 2-я Революционная, 8.**

*Задаток перечисляется до 20.12.2013 г. (включительно), на р/с № 3012540284017 в ЦКО № 2 дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, г. Гомель, МФО 153001739, УНП 490556767.*

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% (17242650 рублей) от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность.

**Срок подачи заявления: с момента выхода настоящего объявления до 16.00. 20.12.2013 года по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

**Дата, время, место проведения открытого аукциона: 23.12.2013 года в 10.00, г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: 8-029-767-88-05, тел.факс 8-0232-68-25-50. Дополнительная информация содержится на сайте www.disponent.by**

*К сведению акционеров ОАО «Современные розничные технологии»*

**17 декабря 2013 года в 9 часов 00 минут по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «Современные розничные технологии»

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Утверждение передаточного акта.
2. Утверждение договора о присоединении.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет проводиться по месту проведения собрания с 08 часов 00 минут до 08 часов 45 минут.

Акционер Общества принимает участие в работе собрания лично или через своего представителя, действующего на основании доверенности. Для регистрации на собрании необходимо при себе иметь паспорт, доверенность.

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг, на основании которого составляется список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров общества – 10 декабря 2013 года.

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться в рабочие дни с 09 часов 00 минут до 17 часов 00 минут с 7 по 16 декабря 2013 года по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3 (приемная) в день проведения собрания – по месту его проведения.

Орган, созывающий общее собрание акционеров ОАО «Современные розничные технологии» – наблюдательный совет.

УНП 690019195 *Наблюдательный совет 017 261 00 89*

## ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

**объявляет о проведении публичных торгов по продаже имущества, принадлежащего**

**ОДО «Производственно-инвестиционная группа»**

**ЛОТ № 1.** Незавершенные строительством незаконсервированные улучшения, расположенные по адресу: г. Минск, пер. С.Ковалевской, 48. Площадь застройки здания в завершенном виде – 6 917 кв.м, объем здания в завершенном виде – 141 323 куб. м, средневзвешенная готовность здания 25,2%, стоимостью 3 768 000 000 (три миллиарда семьсот шестьдесят восемь миллионов) рублей.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества, что составляет 188 400 000 (Сто восемьдесят восемь миллионов четыреста тысяч) белорусских рублей.

На данное имущество отсутствуют проектно-сметная и техническая документации, а также право аренды земельного участка.

**Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/,**
а также в помещении хозяйственного суда г. Минска:
**г. Минск, ул. Академическая, 15/1.**

**Торги состоятся 30.12.2013 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая,15/1, каб. 201**

**За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Никулин А.А., тел./факс: 8(017) 294-93-82, ст.судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел.294-93-67**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г.Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

**ДОПОЛНИТЕЛЬНАЯ ИНФОРМАЦИЯ К ИЗВЕЩЕНИЮ РУП «Белспецконтракт» О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА № 23,**
*опубликованному в газете «Звязда» № 219 от 21.11.13.*
Лот № 449. Грузовой Урал-4320 ш. 018157 дв. 505450 1983 г. 4 кат. 154155 км,
**СЛЕДУЕТ ЧИТАТЬ:**
**Лот № 448. Грузовой Урал-4320 ш. 018056 дв. 504138 1983 г. 4 кат.**

УНП 101099370

Утерянный представительством Белгосстраха по Центральному району г. Минска бланк страхового полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВР № 1796084 **считать недействительным.** УНП 101883943

■ Медыяперсона

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ:

# «ВЕДАННЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ — ГЭТА ПАКАЗЧЫК АДУКАВАНАГА ЧАЛАВЕКА»

**У праграме «Ды@блог пра мову» на канале «Беларусь-3» па панядзелках гавораць, зразумела, пра мову. Госці праграмы на ўласным прыкладзе ілюструюць, што любоў да беларускай мовы не залежыць ад нацыянальнасці, месца пражывання, прафесіі і ўзросту. Для іх мова — гэта і штодзённае жыццё, і стан душы. Некаторыя важныя пытанні сёння абмяркоўваем з вядучым праграмы Навумам Гальпяровічам.**



***— Навум Якаўлевіч, тэма мовы актуальная, аднак як зацікавіць ёю аўдыторыю?***

— Наогул, тэма мовы, умоў яе існавання сёння ў грамадстве, у побыце і ў розных сферах — гэта прастора неабдымная. Таму ёсць розныя аспекты. Спачатку я ставіў перад сабой задачу проста расказаць пра мову. Але ад асветніцтва трэба пераходзіць да канкрэтных прыкладаў функцыянавання мовы. Да праблем звязаных з гэтым. Вельмі важна, каб і суразмоўцы былі цікавыя. І тут я вылучаю тры плыні герояў. Першая плынь — гэта вядомыя людзі. Тыя, якіх ведаюць, якія маюць пэўны аўтарытэт. Другая — людзі розных прафесій і нацыянальнасцяў, для якіх мова з'яўляецца неад'емным сродкам у штодзённым ужытку. І трэцяя — наша сённяшняя моладзь. Мы ў праграме вядзём не толькі агульныя размовы пра мову, але ілюструем усю палітру яе існавання. Для мяне кожная такая гутарка — адкрыццё і задавальненне, радасць з-за таго, што ёсць людзі, якія спакойна і нармальна жывуць з мовай. Тыя, хто лічаць сёння беларускую мову вясковай ці мовай простых людзей, не маюць рацыі, бо ўсё якраз наадварот — гэта паказчык адукаванага чалавека, з пачуццём уласнай годнасці. Перадачы з нашымі героямі — ілюстрацыя таго, што мова жыве, развіваецца, і мы спадзяёмся, так і будзе ўсё працягвацца.

***— Не абмінулі, напэўна, увагай і пытанне білінгвізму?***

— Білінгвізм, я зазначаў гэта ў многіх праграмах, сведчыць пра багацце нашага народа. Бо не кожная краіна можа пахваліцца такой з'явай. Нашы людзі маюць магчымасць свабодна валодаць дзвюма мовамі. Гэта прыкмета адукаванай, развітай, еўрапейскай нацыі. І не варта думаць, быццам адна мова пераважае над іншай. Білінгвізм — гэта роўнасць моў. Гэта не азначае, што кожны павінен заўсёды на дзвюх мовах размаўляць. Асабістая справа кожнага, як размаўляць дома, на вуліцы, на працы. Ніхто нікога не прымушае, але свабодна валодаць мовай і адной, і другой, калі табе трэба на гэтай мове гаварыць, — ёсць вышэйшае дасягненне. Таму мы, калі гаворым пра двухмоўе, якраз падкрэсліваем роўнасць моў і значэнне для кожнага чалавека магчымасці ведаць іх.

***— Гэта, бясспрэчна, важна, аднак часта даводзіцца чуць пытанне, як заахвоціць да вывучэння беларускай мовы?***

— Родная мова — гэта аснова ідэнтыфікацыі і пазіцыянавання сябе ў свеце. Безумоўна, гэта так, але пры ўсім пры тым з-за пэўных праблем, недахопаў можа быць выхавання ў школах узнікае патрэба шукаць стымулы. Асабліва ў сувязі з тым, што адбылася такая пераарыентацыя са з'яўленнем новага пакалення. Яно ўжо ўрбаністычнае. Вырасла ў горадзе і бацькі ўжо, можа, не гаварылі па-беларуску. Таму не кожны ўсведамляе, што гэта самаідэнтыфікацыя, і пра гэта трэба гаварыць. Стымулы павінны быць у тым сэнсе, што для любой справы і для прагматычнага чалавека вельмі важна, каб ён адчуваў патрэбу выкарыстоўваць гэтую мову. Пашырэнне сфер ужытку мовы ў многім залежыць ад саміх людзей. Якія займаюцца мастацтвам, гісторыяй, выхаваннем. Пачынаючы з рэкламы, шыльдаў. Я неяк сутыкнуўся з праблемай рэпертуару нашага музычнага тэатра. У ім не было ніводнага нацыянальнага спектакля. Тэатр аб'явіў конкурс — і матэрыял з'явіўся. Тады галоўны мастацкі кіраўнік кажа, што спектакль пакуль што не атрымаўся цалкам беларускамоўным, бо ні публіка, ні артысты да гэтага не гатовыя. Здзіўляюся гэтай сітуацыі: як гэта ва ўсім рэпертуары, дзе шмат спектакляў, нельга знайсці месца для цалкам беларускамоўнага? А вось італьянскую оперу спяваюць на мове арыгінала ва ўсім свеце. І трупа гатовая да гэтага ў любым еўрапейскім тэатры. Чаму музычны тэатр не можа асвоіць ніводнага спектакля на беларускай мове? А ў тэатры Янкі Купалы на спектаклях аншлагі, бо многія, нават прыезджыя, хочуць пайсці і паглядзець спектакль на нашай мове. У школе праводзяць ранішнікі, дзіцячыя спектаклі. У праграме мы закранулі неяк тэму таго, што нават многія выкладчыкі беларускай мовы ў школе карыстаюцца ёю толькі на ўроку. А настаўнік жа павінен прыклад паказваць. У гэтых праблемах нікога не звінаваціш, бо перш за ўсё прычына ў людзях, у іх псіхалогіі. І наша перадача павінна спрыяць папулярызацыі добразычлівага стаўлення, каб людзі ўсведамлялі, што гэта Беларусь, наша мова і тыя рэчы, якімі можна ганарыцца.

> **Я перакананы, што не крыкам, не лозунгамі, а перш за ўсё асабістым прыкладам, а па-другое разважлівай і ўдумлівай работай трэба дапамагаць мове заняць сваё месца, якое яна павінна займаць.**

***— А чым патлумачыць негатыўнае стаўленне да мовы?***

— Трэба сказаць, што для беларускага менталітэту характэрныя добразычлівасць, спагада. Такія ж якасці трэба і да мовы праяўляць. Ставіцца да яе з павагай. Гэта наш скарб і каштоўнасць. Вельмі добра, калі яна і кожны дзень прысутнічае. Мы рэалісты і таму не варта марыць, быццам у адзін дзень усе раптам загавораць па-беларуску. Бо глабалізм, міграцыя проста не дазваляюць адной мове панаваць. А негатыўныя рэакцыі ўзнікаюць ад няведання. Людзі, якія негатыўна ставяцца да мовы, добрай гаворкі не чулі. Яны не чыталі добрую літаратуру. У іх няма ўяўлення пра багацце нашай мовы.

> **Тыя, хто лічаць сёння беларускую мову вясковай ці мовай простых людзей, не маюць рацыі, бо ўсё якраз наадварот — гэта паказчык адукаванага чалавека, з пачуццём уласнай годнасці.**

У гэтым сэнсе вельмі важныя для мяне былі сустрэчы з замежнікамі. Курт Вулхайзер, прафесар Брандайскага ўніверсітэта ЗША, Арнольд Макмілан, прафесар Лонданскага ўніверсітэта, выдатна гавораць на беларускай мове. Гэта як прыклад таго, што наша мова запатрабавана, што ёю цікавяцца ў свеце. У наступны панядзелак у праграме я буду гутарыць з Арменам Сардаравым. Ён армянін. Але лічыць для сябе неабходным ведаць беларускую мову. Гэта таксама прыклад.

***— Атрымліваецца, на выпады непрымання трэба рэагаваць разважліва?***

— Ніякай агрэсіі, злосці, спакойны тон. Я і мае суразмоўцы ў студыі стараемся на любыя пытанні адказваць адкрыта. Імкнёмся растлумачыць і прыняць розныя пазіцыі. Мы не прычэсваем пытанні, якія ідуць ад аўдыторыі, не рэдагуем іх. Якімі б вострымі і непрыемнымі яны не былі. Трэба агучваць тое, што ёсць праблема. Ёсць людзі, якія не любяць мову, забыліся пра яе, і яны таксама задаюць пытанні. І на іх мае героі адказваюць.

Я перакананы, што не крыкам, не лозунгамі, а перш за ўсё асабістым прыкладам, а па-другое разважлівай і ўдумлівай работай трэба дапамагаць мове заняць сваё месца, якое яна павінна займаць.

***— Закранаючы ролю школы, нельга абмінаць увагай і ўплыў сям'і...***

— Мне здаецца, сёння крыху разбурылася сувязь пакаленняў. Раней была сям'я вясковая, у якой размаўлялі па-беларуску, у школе выкладалі па-беларуску, а потым чалавек мог прыехаць у горад, і там ужо больш функцыянавала руская мова. Гэта крыху парушылася, бо вырасла пакаленне бацькоў, у якіх не была закладзена любоў да мовы. І гэтыя бацька і маці не могуць свайму дзіцяці даць урокаў роднай мовы, бо самі яе не засвоілі. І таму важна ў сям'і з дзецьмі сесці за казкі, дзіцячыя кнігі і разам з дзецьмі прайсці гэтую школу. А настаўнікі тут павінны дапамагчы бацькам. Шмат што залежыць і ад нас, журналістаў, людзей, якія маюць дачыненне да слова, якое гучыць шырока.

Я ведаю не адзін прыклад, калі дзеці на сваім прыкладзе выхавалі бацькоў. Бацькі любяць сваіх дзяцей, таму, думаю, бацькі любоў да беларускага слова заўсёды падтрымаюць. Мой бацька вырас у рабочай сям'і ў Полацку, мовай беларускай не карыстаўся, але заўсёды казаў мне, што трэба любіць беларускую мову. Мова не павінна быць прадметам канфлікту. Мова мусіць быць прадметам павагі, згоды і любові, павінна згуртоўваць людзей, рабіць іх дабрэйшымі.

**Алена ДРАПКО.**

■ 36,6

# Ніякай лазні пры пнеўманіі!

**Запаленне лёгкіх, або пнеўманія, часта ўспрымаецца як прастуда з высокай тэмпературай, кашлем і агульнай слабасцю. Мы не давяраем правераным метадам і спадзяёмся на народныя сродкі. Аднак такая легкадумнасць пагражае ўскладненнямі.**

Варта ведаць, што даўно вынайдзена і выпрацоўваецца прышчэпка ад пнеўманіі. Праўда, дзейсная яна толькі тады, калі запаленне выклікана адным узбуджальнікам — пнеўмакокам. У 52 краінах свету такая прышчэпка ўнесена ў Нацыянальны каляндар абавязковых дзіцячых прышчэпак. Найбольш вядомыя вакцыны — «Прэвенар» (ЗША) і «Пнеўма 23» (Францыя). Першую вакцыну можна ўводзіць усім дзецям з 3 месяцаў жыцця, другую — з 2 гадоў. У большасці выпадкаў запаленне лёгкіх у малых да пяці гадоў выклікаецца пнеўмакокавай інфекцыяй, якая цяжка паддаецца лячэнню і дае высокі працэнт цяжкіх наступстваў. Спецыялісты адзначаюць, што самым надзейным і дзейсным сродкам барацьбы з пнеўманіяй з'яўляецца масавая вакцынапрафілактыка.

Узбуджальнікамі пнеўманіі з'яўляюцца самыя розныя бактэрыі, мікробы і вірусы — пнеўмакокі, стафілакокі, гемафільная палачка, кішэчная палачка і інш. Дзеці часцей за дарослых хварэюць на пнеўманію, якая выклікаецца мікробамі мікаплазмы. Гэтыя мікробы адначасова падобныя і на бактэрыі, і на вірусы. А вось запаленне лёгкіх, выкліканае ўзбуджальнікам легіянела, практычна не сустракаецца ў дзяцей. Дарэчы адной з крыніц легіянел з'яўляюцца сістэмы для кандыцыяніравання паветра. Адкрытая і новая група ўзбуджальнікаў — бактэроіды, якія працяглы час лічыліся непатагеннай флорай ротавай поласці. Сустракаюцца і небіялагічныя агенты пнеўманіі, напрыклад, бензін. У залежнасці ад разнавіднасці ўзбуджальніка і павінен прызначацца той ці іншы антыбіётык. Таму неабходна здаць аналіз макроты. А ён робіцца ў стацыянары.

Бальнічная пнеўманія антыбіётыкамі не лечыцца. Гэта форма ўзнікае ў хворых і медперсаналу, якія атрымалі мікробы з бальнічнага асяроддзя — устойлівыя да антыбіётыкаў.

**1.** Пнеўманію, якая часта ўзнікае з-за пераахалоджвання, можна лячыць цеплынёй. Але ў лазню адпраўляцца нельга. Высокая тэмпература і без таго выпрабоўвае нашу сардэчна-сасудзістую сістэму. А ў парылцы сэрца зусім можа не вытрымаць тэмпературнага ўдару. Меркаванне аб тым, што хвароба выходзіць з потам — беспадстаўнае. Збіваць тэмпературу пры вострай пнеўманіі дапамагаюць, як ні дзіўна, халодныя кампрэсы, якія трэба мяняць кожныя паўгадзіны.

**2.** Пры тэмпературы цела да 37 градусаў можна прымяняць сагравальныя кампрэсы, гарчычнікі на грудную клетку, гарачыя нажныя ванны. Для лепшага аддзялення макроты даюць цёплае малако напалову з баржомі або содай (1/2 лыжкі на шклянку малака). Пры густой макроце паказаны растворы соляў ёду. Можна ўзяць 3 ст. л. свежых пладоў маліны, заліць дзвюма шклянкамі гарачай вады, настояць 45 хвілін, працадзіць і піць.

**3.** Як толькі тэмпература зніжаецца да 37 градусаў, доктар можа рэкамендаваць лячэбную фізкультуру (каб не было застою ў лёгкіх). Можна, скажам, надзімаць паветраныя шарыкі. Рэкамендуецца дыхальная гімнастыка:

✓ Стоячы сагнуць рукі перад грудзямі — глыбокі ўдых, энергічна адвесці локці назад і падняць галаву — выдых.

✓ Стоячы падняць рукі над галавой — удых, апусціць — выдых. Паўтарыць 15–20 разоў.

✓ Ногі на шырыні плеч, рукі ў бакі — удых, энергічна нахіліцца наперад. Дакрануцца пальцамі долу — працяглы выдых. Паўтарыць 7–10 разоў.

✓ Рукі на бёдрах. Паварочваем тулава — 3–5 разоў у кожны бок.

**Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Добрая навіна

# Ландшафтны заказнік «Азёры» пад торфаздабычу не аддадуць

**Міністэрства энергетыкі і Нацыянальная акадэмія навук выступілі за захаванне рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Азёры». Пра гэта рэдакцыі паведаміла каардынатарка кампаніі «У абарону беларускіх балот!» Вольга Каскевіч. Такім чынам праект пастановы Савета Міністраў, які прадугледжвае вывад часткі заказніка з прыродаахоўнай зоны і наступную яго перадачу пад торфаздабычу, не знайшоў падтрымкі сярод гэтых ведамстваў.**

Менавіта такой пазіцыі наконт заказніка «Азёры» прытрымліваецца і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Нагадаем, што пытанне здабычы торфу ў радовішчы «Святое», якое з'яўляецца часткай заказніка «Азёры», быў разгледжаны на грамадскіх слуханнях сёлета 2 лістапада. Кіраўніцтва міністэрства паведаміла, што, «улічваючы думку пераважнай большасці прысутных на грамадскіх слуханнях, Мінпрыроды ўнесла ва ўрад праект пастановы Савета Міністраў, які не прадугледжвае выключэнне ўчастка тарфяного радовішча «Святое, 112» са складу зямель заказніка «Азёры».

Акрамя таго, прыродаахоўнае ведамства накіравала ў Мінэнерга прапанову аб сумеснай падрыхтоўцы і ўнясенні ва ўрад прапаноў аб адмене пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 чэрвеня 2011 г. № 794. Нагадаем, што, згодна з гэтай пастановай, 8 балот, якія ўваходзяць у склад прыродаахоўных тэрыторый, могуць быць аддадзены пад здабычу торфу. Экологі ахрысцілі гэты дакумент «антыбалотным».

«Мінпрыроды неаднаразова выказвала занепакоенасць па пытанні негатыўных экалагічных наступстваў, звязаных з вывадам тарфяных радовішчаў з асабліва ахоўных прыродных тэрыторый», — гаворыцца ў заяве міністэрства.

**Сяргей КУРКАЧ**

# Беларусы замахнуліся на ўласную антарктычную станцыю

**Беларускія палярнікі адправіліся ў новую экспедыцыю. На ледзяны кантынент яны прыбудуць 14 снежня. Беларуская антарктычная экспедыцыя ў складзе 59-й Расійскай антарктычнай экспедыцыі будзе праходзіць па 14 красавіка 2014 года.**

Удзельнікамі шостай Беларускай антарктычнай экспедыцыі сталі начальнік экспедыцыі Аляксей Гайдашоў, інжынер-эколаг Навукова-вытворчага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах Юрый Гігіняк і інжынер-геафізік Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ Ілья Бручкоўскі. Начальнік экспедыцыі Аляксей Гайдашоў упэўнены, што 2014 год стане для нашай навукі вызначальным. **У наступным годзе плануецца распачаць будаўніцтва ўласнай беларускай антарктычнай станцыі.** Таму будзе падрыхтавана ацэнка ўздзеяння станцыі на навакольнае асяроддзе. Справаздача будзе прадстаўлена ў міжнародныя органы для таго, каб эксперты пераканаліся, што будаўніцтва і дзейнасць самой станцыі не зробяць негатыўны ўплыў на экалогію Антарктыкі. Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір Гусакоў падкрэслівае, што для Акадэміі навук адпраўка шостай Беларускай антарктычнай экспедыцыі — пацвярджэнне таго, што Беларусь з'яўляецца краінай, якая праводзіць паўнамаштабныя ўнікальныя даследаванні міжнароднага значэння.

Падчас шостай экспедыцыі беларускія палярнікі будуць праводзіць даследаванні па пяці навуковых кірунках, у тым ліку з выкарыстаннем новых тэхнічных сродкаў беларускіх распрацоўшчыкаў. Напрыклад, будзе праведзена серыя вымярэнняў аптычных характарыстык і мікраструктур аэразолю ў прыбярэжнай зоне Антарктыкі з дапамогай спектральнага скануючага сонечнага радыёметра, серыя актынаметрычных назіранняў і вымярэнняў з дапамогай аўтаматызаванай сістэмы актынаметрычных назіранняў «Пеленг СФ-16»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Даты | Падзеі | Людзі

**1768** год — выйшаў першы том славутай энцыклапедыі «Брытаніка». Тэрмін «энцыклапедыя» сталі шырока ўжываць у XVI стагоддзі. Але яшчэ за дзве тысячы гадоў да нараджэння Хрыстова энцыклапедычнымі працамі карысталіся ў Старажытным Егіпце, а затым і ў Старажытным Кітаі. Адна з першых універсальных энцыклапедый на англійскай мове — «Брытаніка» — вядзе сваю гісторыю з 6 снежня 1768 года, калі выйшаў яе першы том. У той час «Брытаніка» складалася толькі з трох тамоў і змяшчалася на 2391-й старонцы. У 1797 годзе завяршылася яе трэцяе выданне, якое складалася ўжо з 18 тамоў. Сучаснае, 15-е выданне «Брытанікі», мае 32 тамы, у ім 120 тысяч артыкулаў, каля 44 мільёнаў слоў і больш за 1000 ілюстрацый. А яе аўтары — вядучыя сусветныя эксперты, сярод якіх дзясяткі лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі.



**1812** год — бачачы канчатковую гібель свайго войска, Напалеон, не даязджаючы да Вільні, панёсся на санках у Парыж. Вось як успамінаў пра гэта герцаг Арман дэ Каленкур, які суправаджаў яго. «У гэты дзень трое мясцовых сялян напалохалі ўвесь абоз, але ледзь толькі сабраліся некалькі пехацінцаў, як сяляне ўцяклі, разрабаваўшы папярэдне два генеральскія экіпажы. Імператар быў паглыблены ў чытанне дэпеш з Францыі, а мы ўсе радаваліся лістам, атрыманым ад блізкіх. У Парыжы былі занепакоеныя перапынкам у атрыманні паведамленняў з войска, але там далёка не ўяўлялі сабе нашых бедаў. Памяць аб мінулых паходах імператара падтрымлівала веру і выклікала такі спакой, што наша доўгае маўчанне зрабіла значна менш глыбокае і непрыемнае ўражанне, чым можна было чакаць».

**1933** год — нарадзілася (горад Орша) Зінаіда Якаўлеўна Мажэйка, беларускі этнамузыколаг, доктар мастацтвазнаўства, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Асноўныя даследаванні па тыпалогіі і меласе абрадавага фальклору, экалогіі руральнай (гісторыка-стылёвай) культуры, гісторыі этнамузыказнаўства. Арганізавала выпуск грампласцінак, у іх ліку «Музычны фальклор Беларускага Палесся» з серыі «Музычны фальклор народаў свету» (Гран-пры ЮНЕСКА, 1988). Паводле яе сцэнарыяў знята 7 дакументальных музычна-этнаграфічных фільмаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1994).

Было сказана

**Фёдар ЯНКОЎСКІ, лінгвіст, пісьменнік:**

*«Шануеш людзей — то і людзі цябе шанаваць будуць».*

УП «ЖРЭО Центрального района г. Минска» НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ ТРЕБУЮТСЯ:

✓ СПЕЦИАЛИСТЫ (с опытом работы):
- главный инженер, главный бухгалтер УП ЖЭС № 13 (ул. Нововиленская, 6)
- мастер УП ЖЭС 27 (ул. Орловская, 24) УП ЖЭС 38 (ул. Сторожевская, 8)
- начальник производственного отдела
- начальник отдела благоустройства (на период д/о)
- мастер ремонтного участка
- инженер-энергетик
- паспортист РСЦ2 (пр. Победителей, 83)

Возможен карьерный рост!

✓ РАБОЧИЕ:
- трактористы
- водитель автобуса
- водитель погрузчика
- наладчик КИП и А
- слесарь-сантехник УП ЖЭС
- кровельщик по металлическим кровлям УП ЖЭС
- маляр УП ЖЭС (Требования 3-4 разряд)
- электромонтер УП ЖЭС (Требования 3-4 разряд)
- оператор ПЭВМ диспетчерской службы
- оператор ПЭВМ РСЦ2 (пр. Победителей, 83)
- рабочие по комплексной уборке УП ЖЭС

Возможно обучение и повышение квалификации по указанным профессиям на производстве

СВОЕВРЕМЕННАЯ з/плата! ПОЛНЫЙ СОЦ. ПАКЕТ (оказание мат. помощи к отпуску, выделение путевок на оздоровление, постановка на квартирный учет нуждающихся)!

Дружный и доброжелательный коллектив! Будем рады всем!

Обращаться по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 20А. Тел. (8017) 327 67 52.

УНП 100055817

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 9.12 | 16.49 | 7.37 |
| Віцебск | — 9.09 | 16.31 | 7.22 |
| Магілёў | — 9.02 | 16.39 | 7.37 |
| Гомель | — 8.50 | 16.44 | 7.54 |
| Гродна | — 9.26 | 17.06 | 7.40 |
| Брэст | — 9.18 | 17.14 | 7.56 |

**Месяц**

***Першая квадра 9 снежня. Месяц у сузор'і Вадалея.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандра, Аляксея, Барыса, Макара, Мітрафана, Рыгора, Фёдара.*
***К.*** *Леанціны, Емяльяна, Здзіслава, Зянона, Мікалая.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

А камандаваць у доме павінен хтосьці АДНА!

**— Дарагая, што за рыба ў нас у юшцы плавае?**
**— Табе што, мая юшка не падабаецца?!**
**— Супакойся, юшка падабаецца. Мне не падабаецца, што рыба яе есць.**

Учора быў першы снегапад. Па ўсім горадзе адбываліся сустрэчы членаў элітарнага клуба «Аматары летняй гумы».

**Да пятніцы гатовы!**
**Мабільны зараджаны, баланс папоўнены, у кішэні паперка з маім адрасам!**

SMS ад мужа
«Каханая, я моцна параніў нагу на працы. Наста мяне прывезла. Нагу могуць ампутаваць...».
SMS ад жонкі:
«ХТО ТАКАЯ НАСТА?!»



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 22.758. Індэкс 63850. Зак. № 5145.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 5 снежня 2013 года.